ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ ЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

№ 133 (3241) Пятніца, 14-га Чэрвеня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—819, кантора—781

ГАДЫ ПАСЛЯ ЧОРНАЙ НОЧЫ:

ПАРЫЖ, 13. Агенцтва Гавас паведамляе: „паводле зьвестак вайсковага міністэрства страты французскіх войскаў ад сутычкі з паўстанцамі ў Эльборджы (Марокка) складаюць—81 чал. забітых і 38 параненых. У раёны вайсковых дзеяньняў тэрмінова паспаны падмацаваньні"

НОВЫЯ НАВІНЫ Б. С. С. Р.

МАЗЫР. (Наш кар.) 11 чэрвеня, у зьвязку з тым, што кулакі і гандляры адмовіліся заключыць з прафсаюзамі працдагавары, пастухі г. Калінкавічы абвясьцілі забастоўку. Батракі патрабуюць неадкладнага заключэньне дагавору, устанаўленьне для кожнага пастуха зарплаты ў 28 р. і сваячасовая яе выдача, а таксама выдача патрэбнай спэцвопраткі

Першыя вынікі бальшавіцкае праверкі

Учора мы зьмяшчалі гутарку з старшынёй праверачнай камісіі ЦКК УсеКП(б) т. Герасімавым, які паведаміў аб выніках праверкі кіруючых кадраў КП(б)Б. Гэтыя вынікі заслугоўваюць увагі ўсіх партыйных арганізацый.

Яны датычаць тэй арганізацыі, якая займае адно з першых месц у КП(б)Б—Менскай партарганізацыі. Гэтая акалічнасьць яшчэ больш павялічвае іх важнасьць.

Аб чым-жа гавораць першыя вынікі праверкі? Першае, што мы адзначаем, гэта вялікую актыўнасьць і зацікаўленасьць, якую праяўляе партыйная і беспартыйная маса да праверкі радоў партыі. Ня гледзячы на тое, што куставыя сходы ахаплялі тэрытарыяльна шырокія раёны, залі клюбаў напаўняліся цалкам партыйцамі і беспартыйнымі рабочымі.

Важна адзначыць, што ні на адным сходзе не заўважвалася выпадкаў павярхоўнай цікаўнасьці, жаданьня выслухаць «цікавы» анэкдот і г. д. На праверачных сходах было другое»: на працягу гадзін маса ўдзельнікаў сходаў уважліва слухала, выступала, падавала рэплікі і запытаньні правяраемым т. т., дапамагаючы камісіі дасканала высьветліць твар і работу кожнага правяраемага таварыша.

Вось чаму маса была «прыдзірлівай» да тых т. т., якія мелі ў мінулым хістаньні, або знаходзіліся ўрадох чужых партый. Вось чаму, з другога боку, у залі наглядаўся вялікі ўздым, калі праводзілі з трыбуны тых т. т., якія раскрывалі перад масамі сваё багатае рэвалюцыйнае мінулае, сваё жыцьцё барацьбітоў-рэвалюцыянэраў.

Такім чынам, на падставе першай практыкі мы можам сказаць, што чыстка праводзіцца ў адпаведнасьці з паказаньнямі т. Леніна: «чысьціць партыю, лічачыся з паказаньнямі беспартыйных працоўных. Разам з тым, мы можам адначыць тое вялізарнае давер'е, якім карыстаецца наша партыя сярод працоўных, што так яскрава выявілася на першых праверачных сходах.

Другі, ня менш важны вывод гэта бальшавіцкая моц і загартаванасьць нашых кіруючых кадраў. Як вядома, першымі правяраліся члены такіх органаў партыі, як ЦК, ЦКК, акругком, АКК і кіруючы склад партарганізацыі Чырвонай арміі, разьмешчанай у Менску.

Партыя мае права сказаць, што, ня гледзячы на дэмагогію трацкістых і правых, кадры партыі, як асноўны касьцяк, зусім здаровы і здольны правільна выконваць ае лінію. Гэта значыць, што КП(б)Б, працуючы ва ўмовах невялікай колькасьці пралетарыяту, змагла **выхаваць і загартаваць** дзесяткі і сотні моцных бальшавікоў ленінцаў.

Мы зможам гэта сказаць з поўным правам, бо гэта ёсьць таксама заява рабочае масы, што ўдзельнічае і актыўна дапамагае партыі па правядзеньні чысткі.

Тое самае мы можам сказаць аб кадрах, што складаюць бальшавіцкае ядро нашае Чырвонае арміі. Уся чырвонаармейская маса з вялізарнай актыўнасьцю і ўважлівасьцю выяўляла ўсе бакі работы кожнага партыйца-камандзіра, палітработніка, кіраўніка партарганізацыі. І ўсюды вывад чырвонаармейскай масы быў адзін: камандзір і начальнік-камуністыя зьяўляюцца нашымі таварышамі, старшымі кіраўнікамі. І тут мы наглядаем, якімі сымпатыямі карыстаецца партыя, стварыўшая армію рэвалюцыі—Чырвоную армію.

Наперакор прадраканьням меншавікоў і абываталяй, чыстка партыі ня толькі праходзіць паспяхова, але часта выліваецца ў дэманстрацыі глыбокага давер'я працоўных мас да сваёй партыі. Важна адзначыць, што выпадкаў дэмагогіі і зьвядзеньня асабістых рахункаў не наглядалася (за выключэньнем адзінкавых пісулек бяз подпису). Гэта гаворыць аб тым, што маса ўсьвядоміла клясавыя задачы чысткі партыі.

Такія дадатныя вынікі, што даюцца першай практыкай чысткі. Але разам з тым мы павінны добра ўлічыць тую адмоўную практыку, якую дае чыстка. Прыкладам такое «практыкі» зьяўляецца ячэйка «Меншвэй». Яна ня здолела падрыхтавацца, як належыць, да чысткі, ня здолела даць характарыстыкі члену ЦК т. Ландау, прымацаванаму да ячэйкі. Гэтага нельга ня зьвязваць з агульным станам ячэйкі. І цэнтральная праверачная камісія зрабіла зусім правільна, калі вылучыла спэцыяльную камісію для дасканалага высьвятленьня стану ячэйкі і ўзаемаадносін з беспартыйнымі.

Былі таксама ячэйкі, якія амаль нічога не зрабілі для таго, каб падрыхтаваць і прыцягнуць рабочых да ўдзелу ў чысткі партыі. Ёсьць прыклады, калі ячэйкі правілі недапушчальную абыякасьць да гэтай вялізарнай работы.

Работа па чысткі радоў партыі толькі пачалася.

Нам трэба са ўсёй уважлівасьцю ўлічыць тыя недахваты, якія яна выявіла. Наш асноўны вывад можа быць толькі такі: скарыстаць першую практыку праверкі кіруючых кадраў, для таго, каб дабіцца яшчэ большага ўдзелу рабочых мас у чысткі, каб узьняць на вышэйшую ступень баяздольнасьць усёй КП(б)В і яе аўтарытэт сярод працоўных мас.

Гэтага мы можам і павінны дабіцца.

430 тысяч рабочых пераведзена на 7 гадзін

ВЫПРАЦОЎКА ФАБРЫКІ ПАВЯЛІЧЫЛАСЯ

Наркамправы СССР падагуліў вынікі работы сямігадзінных фабрык за апошні два гады.

Летась на сямігадзінную работу было пераведзена 20 бавоўняных і 4 ваўняных фабрыкі. На гэтых фабрыках да пераходу працавала 104,5 тысяч рабочых. Апрача таго, на 7 гадзін было пераведзена некалькі іншых прадпрыемстваў.

За ўвесь бягучы год на 7-гадзінную работу пераведзена больш 310 тыс. рабочых. Усяго за два гады на сямігадзінную работу пераведзена 430 тыс. чалавек.

Перавод прадпрыемстваў па сямігадзінны рабочы дзень цалкам сябе апраўдаў і даў добрыя вынікі. На тэкстыльных фабрыках дзякуючы пераходу на 7 гадзін, былі прыняты новыя дзесяткі тысяч рабочых. Больш разумна скарыстоўваецца рабочы дзень, больш прадукцыйна скарыстоўваюцца машыны. Агульная выпрацоўка павялічылася.

Такія-ж добрыя вынікі даў перавод на сямігадзінную работу моталёвых і хэмічных прадпрыемстваў.

ЗЬЕЗД НЯМЕЦКАЕ КАМПАРТЫІ

ПЕРАД НОВЫМІ БАЯМІ

КАМПАРТЫЯ НЯМЕЧЧЫНЫ ПАВІННА ЗАВАЯВАЦЬ БОЛЬШАСЬЦЬ РАБОЧАЕ КЛЯСЫ

Без ачышчэньня ўласных радоў ад апартуністых нельга кіраваць масамі

СПРЭЧКІ ПА ДАКЛАДУ т. ТЭЛЬМАНА

ПРАКТЫКА РАБОТЫ ПАЦЬВЕРДЗІЛА ПРАВІЛЬНАСЬЦЬ ЛІНІІ ПАРТЫІ І НОВАЙ ТАКТЫКІ

БЭРЛІН, 12. На зьезьдзе нямецкае кампартыі працягваліся спрэчкі па дакладу т. Тэльмана. Выступіла шмат дэлегатаў з месц, якія ў сваіх прамовах падкрэсьлівалі, што практыка работы на мясцох пацьвердзіла правільнасьць лініі партыі і новай тактыкі, асабліва ў першамайскія дні, а таксама правільнасьць барацьбы супроць правых і прымірэнцаў.

Дэлегат Рурскай вобласьці заявіў, што барацьба ў Рурскай вобласьці пацьвердзіла, што левыя сацыял-дэмакраты зьяўляюцца самымі небясьпечнымі ворагамі камунізму і рабочае клясы.

БОЛЬШ РАШУЧА ВЕСЬЦІ БАРАЦЬБУ З ПРЫМІРЭНЦАМІ

Дэлегат Сілезкага тэкстыльнага раёну кажа, што прымірэнцы і правыя разьвіваюць агітацыю, накіраваную супроць кіраўніцтва партыі і непасрэдна супроць кіраўніцтва эканамічнай барацьбою на мясцох. Дэлегат акругі Эргсбірге таксама лічыць, што партыя вельмі позна выступіла з энэргічнымі мерапрыемствамі супроць прымірэнцаў. Акруговая арганізацыя літаральна ўздыхнула, калі партыя, нарэшце, ўзялася за рашучую барацьбу з прымірэнцтвам.

ВЫСТУПЛЕНЬНЕ ЛІДЭРА ПРЫМІРЭНЦАЎ ЭВЭРТА

У спрэчках выступіў лідэр групы прымірэнцаў тав. Эвэрт. Зьезд толькі пасьля паўторных намаганьняў т. Тэльмана, згадзіўся прадоўжыць час для выступленьня т. Эвэрта. Тав. Эвэрт заявіў, што выкрыцьцю і барацьбе супроць буржуазна-дэмакратычнае рэспублікі, як сучаснае формы дыктатуры фінансавага капіталу перашкаджае ціперашняя лінія партыі і такія фармулёўкі, як напрыклад: «Не дэмакратыя, а фашызм галоўнейшы вораг Нямеччыны». Усякая буржуазная дэмакратыя ўжывае тэрарыстычныя мэтады. Тым ня менш, адна гэта акалічнасьць яшчэ не перарабляе дэмакратыю ў фашызм. Адносіны прымірэнцаў да групы Брандлераўцаў зараз, як і раней, выражаюцца ў адхіленьні тэорыі і практыкі гэтае групы. Прымірэнцы выказваюцца супроць унутрыпартыйнага курсу цэнтральнага камітэту, разглядаючы яго, як адлюстраваньне няправільнае масавай палітыкі. Калі партыя выкажацца супроць прымірэнцаў, дык яны будуць праводзіць у жыцьцё пастановы партыі і Камінтэрну, аднак, будуць крытыкаваць гэтыя пастановы і абараняць сваю думку ў рамках праграмы і статуту партыі.

«ТРЭБА ЎМЕЦЬ ЗРАБІЦЦА ЛЕПШЫМІ ЛЮДЗЬМІ Ў III ІНТЭНАЦЫЯНАЛЕ»

Тав. Мінцэмбэрг зазначыў, што Эвэрт у сваім выступленьні запэўніваў партыю, што ён будзе праводзіць у жыцьцё пастановы нямецкае кампартыі і Камінтэрну. Тым ня менш, адначасова ён выказаўся супроць гэтых пастаноў. Па пытаньні аб фашызьме і дэмакратыі, Эвэрт адмовіўся ад сваёй старой няправільнай фармулёўкі, замяніўшы яе новаю, якая таксама няправільная. Важна ня форма, а сутнасьць, і гэтай сутнасьцю зьяўляецца тэрарыстычная дыктатура фінансавага капіталу. Брандлер нагла заяўляе, што партыя страціла старую гвардыю. На гэта мы можам адказаць, што большасьць крызісаў кіраўніцтва партыі былі выкліканы тым, што таварышы, якія былі некалі ў радох «Спартак», не змаглі абярнуцца ў бальшавікоў. Тое, што яны былі некалі лепшымі людзьмі ў 2-м інтэрнацыянале, гэта нічога ня значыць. Трэба ўмець зрабіцца лепшымі людзьмі ў III-м Інтэрнацыянале.

Далей, выступілі некалькі дэлегатаў ад правінцыі, а таксама дэлегаты ад камуністычнае моладзі. Усе гэтыя прамоўцы гаварылі аб неабходнасьці энэргічных мер для ліквідацыі прымірэнцтва і для абраньня моцнага аднадушнага і ня ведаючага хістаньняў ЦК.

Пасьля дакладу т. Тэльмана з справаздачаю аб рабоце нямецкага саюзу камуністычнае моладзі выступіў т. Гэбіх.

ПРАМОВА ТАВ. СЭМАРА

БЭРЛІН, 13. Цэнтрам увагі ўчарашняга пасяджэньня зьезду нямецкае кампартыі была прамова прадстаўніка Выканкому Камінтэрну Сэмара, якога зьезд спаткаў бурнымі авацыямі і пяяньнем «Інтэрнацыяналу».

НЯМЕЦКАЯ КАМПАРТЫЯ МАЕ ВЯЛІЗЬНЕЙШУЮ ПРАКТЫКУ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ БОЕК

Сэмар гаворачы пра значэньне нямецкае кампартыі ў Камінтэрне зазначае, што **партыя мае вялізьнейшую практыку рэвалюцыйных боек у краінах капіталу за апошнія гады і мае найбольш вымуштраваныя і загартаваныя ў рэвалюцыйнай барацьбе партыйныя кадры».**

Пасьля надрабязнага разгляду міжнароднага становішча, Сэмар заявіў што прыход да ўлады ўраду Макданальда ніякім чынам не азначае пачатку пацыфісцка-дэмакратычнае эры, або поўнай ліквідацыі англа-амэрыканскіх супярэчнасьцяй. Гэты ліжэ-рабочы ўрад будзе працягваць палітыку ангельская імпэрыялізму і акружэньня СССР, але толькі больш складанымі «удасканаленымі мэтадамі».

КАМУНІСТЫЯ ЗАВАЯВАЛІ БОЛЬШАСЬЦЬ У ВАЖНЕЙШЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАХ

Перайшоўшы да становішча ў капіталістычных краінах, Сэмар адзначыў, што гэты год характарызуецца абвастрэньнем клясавых супярэчнасьцяй ва ўсіх краінах. Пры такім становішчы рэчаў, тактычны паварот, зроблены 6-м кангрэсам Камінтэрну і 4-м кангрэсам Прафінтэрну набывае асаблівае значэньне. Гэты паварот паўней і больш пасьлядоўна праведзен у Нямеччыне. Кампартыя Нямеччыны першая правільна паставіла праблему неарганізаваных рабочых і самастойнага кіраўніцтва эканамічнымі бойкамі.

Нямецкая кампартыя ўжо заваявала большасьць у важнейшых прамысловых прадпрыемствах. **Але перад ёю стаіць яшчэ вялікая задача—заваяваньне большасьці рабочае клясы ўсяе Нямеччыны.** Майскія падзеі ў Бэрліне паказваюць як хутка можа ўзьняцца барацьба працоўных на вышэйшую палітычную ступень. Разам з тым майскія падзеі аказаліся сур'ёзным экзаменам для нямецкае кампартыі і выкрылі яе слабыя і моцныя бакі. З аднаго боку гэтыя бойкі паказалі, што партыя надрыхтавана весьці масы ў бой. З другога боку яны выкрылі арганізацыйныя недахопы ў справе мабілізацыі самых шырокіх мас, нявыстарчальную сувязь з буйнымі прадпрыемствамі і нявыстарчальную прыстасаванасьць партыйных кадраў і мэтадаў партыйнае работы да ўмоў абвостранае рэвалюцыйнае сытуацыі.

ЗМАГАНЬНЕ СУПРОЦЬ ПРАВЫХ МАЕ МІЖНАРОДНАЕ ЗНАЧЭНЬНЕ

Выканком Камінтэрну пераконан, што кампартыя Нямеччыны скарыстае з сваёй практыкі ўсе патрэбныя заключэньні і выводы.

Без ачышчэньня ўласных радоў ад апартуністых, нельга кіраваць масамі. Змаганьне кампартыі ў Нямеччыне супроць правых мае міжнароднае значэньне. Яна прадстаўляе прагрэсуючую бальшавізацыю нямецкае кампартыі і падрыхтоўку да новых вялікіх боек.

Чыстка нямецкае кампартыі ад апартуністычных элемэнтаў яшчэ не закончана. Ролю правых узялі на сябе прымірэнцы. Кампартыя павінна—не дапушчаць да кіруючых функцыі прымірэнцаў, якія не адмовяцца ад апартуністычных пазыцый і не далучацца да лініі партыі. Партыя павінна папярэдзіць прымірэнцаў, што іх спаткае лёс выключаных ліквідатараў, калі яны будуць працягваць сваю дзейнасьць на плятформе прад'яўленае імі дэкларацыі.

Сваю прамову Сэмар закончыў заявай аб тым, што задача кампартыі Нямеччыны заключаецца ў мабілізацыі самых шырокіх мас супроць пагражаючае партыі забароны і адначасова падрыхтоўкі мерапрыемстваў для далейшае рэвалюцыйнае барацьбы.

Ня гледзячы на тое, што Біль у перастрэлцы рабочых з паліцыяй ня браў ніякага ўдзелу, газэты тэкстыльных фабрыкантаў Гастоніі патрабуюць для яго кары сьмерці.

Дэманстрацыя бэрлінскага пралетарыяту

У дзень адкрыцьця 12-га зьезду нямецкае кампартыі ў Бэрліну адбылася 20-тысячная дэманстрацыя бэрлінскіх рабочых.

На здымку: дэманстрацыя Веддынгскіх рабочых. Выдзяляецца плякат з надпісам: «За абарону Савецкага Саюзу».

Па Савецкім Саюзе

УЦЯКАЮЦЬ З ПАЛЯСТЫНЫ

У Кіеў прыбыло некалькі яўрэйскіх сем'яў, якія пакінулі нядаўна Палястыну. Прыехаўшыя паведамляюць пра цяжкое становішча працоўных у Палястыне і пра вялікае беспрацоўе. У шырокіх рабочых колах расьце вялікае імкненьне выехаць з Палястыны. Значна ўзмацнілася эміграцыя з Палястыны ў Амэрыку і іншыя краіны.

Кулакоў-шкоднікаў—да расстрэлу

МІКАЛАЕЎ, 12. Надзвычайная сэсія акрсуду прыгаварыла да расстрэлу двух кулакоў, якія актыўна выступалі супроць савецкае ўлады. У 1919 г. яны выдавалі белагвардзейцам савецкіх і партыйных працаўнікоў. Апошнія гады яны ўсляк перашкаджалі калектывізацыі.

Пабудова цеплаходаў

ЛЕНІНГРАД, 12. На заводзе імя Марты пачата пабудова двух тавара-пасажырскіх цеплаходаў для морскае лініі Адэса—Марсэль. Судны будуюцца па чарцяжох нямецкае фірмы Шыхау. Мэханізмы для іх будуць атрыманы з-заграніцы. Судны будуць гатовы да восені 1930 г.

Тав. Красікаў—пракурор Вярхоўнага суду СССР

МАСКВА, 12. Прэзыдыум ЦВК СССР назначыў т. Красікава пракурорам вярхоўнага суду СССР і таварыша Вінакурава—старшынёю вярхоўнага суду РСФСР.

Тав. Савельлеў—адказны рэдактар „Известий"

МАСКВА, 12. Прэзыдыум ЦВК СССР назначыў адказным рэдактарам газэты «Известия» тав Савельлева.

Прыехалі амэрыканскія турысты

ЛЕНІНГРАД, 12. Сёньня ў Ленінград прыехалі на параходзе «Рыкаў» 50 амэрыканскіх турыстых, а праз фінскую мяжу—30 амэрыканцаў. Заўтра на параходзе «Палонь» маюць прыехаць яшчэ 150 амэрыканцаў. Турысты накіроўваюцца ў Маскву.

Мэджыліс зацьвердзіў маскоўскі пратакол

ТЭГЕРАН, 13. Мэджыліс (пэрсыдзкі парлямант) зацьвердзіў далучэньне Пэрсіі да маскоўскага пратаколу аб датэрміновым увядзеньні пакту Келёга.

Прынцыпы Камінтэрну і Прафінтэрну прасяклі ў масу савецкага прафруху

Правыя ўхілістыя атрымалі рэзкі адпор ад усяго прафактыву

Тав. Лазоўскі—аб выніках другога пленуму УсеЦСПС

МАСКВА. На пасяджэньні выканбюро Прафінтэрну 11-га чэрвеня па дарученьні прэзыдыуму УсеЦСПС і просьбе членаў Выканбюро, тав. Лазоўскі зрабіў даклад аб другім пленуме УсеЦСПС. Тав. Лазоўскі коратка спыніўся на важнейшых пытаньнях, што абгаваравіліся на пленуме, асабліва, на пытаньні аб удзеле савецкіх прафсаюзаў у правядзеньні ў жыцьцё пяцігадовага пляну разьвіцьця народнае гаспадаркі СССР і на іншых пастановах пленуму.

У заключэньне свайго дакладу, тав. Лазоўскі асьвятліў становішча, якое стварылася ў савецкім прафруху ў выніку таго, што група кіруючых прафпрацаўнікоў апынулася сярод правых ухілістых і імкнулася стварыць з савецкіх прафсаюзаў базу для сваёй барацьбы супроць генэральнае лініі партыі. Гэтыя правыя настроі атрымалі рэзкі адпор як з боку радавое членскае масы, так і ўсяго праф'актыву, што сьведчыць аб тым, як глыбока прынцыпы Камінтэрну і Прафінтэрну прасяклі ўсю членскую масу савецкага прафруху.

Тав. Лазоўскі падкрэсьліў, што правы ўхіл у гэтых таварышоў праявіўся ня толькі ўнутры партыйных, але і ў прафсаюзных пытаньнях і ў прыватнасьці, у пытаньнях міжнароднага прафруху, што знайшло сваё адлюстраваньне на 4-м кангрэсе Прафінтэрну, на якім некаторыя з кіруючых прафпрацаўнікоў ідэёва і арганізацыйна салідарызаваліся з лініяй нямецкіх правых, што знаходзяцца зараз па-за Камінтэрнам і Прафінтэрнам, ствараючы тым самым ненармальныя ўзаемаадносіны паміж Прафінтэрнам і УсеЦСПС.

Па дакладу тав. Лазоўскага выступілі члены выканбюро т.т. Віткоўскі, Джэрмамэта, Юзэфовіч і Гэй. У выступленьнях аднагалосна асуджвалася палітыка правых ухілістых і падкрэсьлівалася вялізная важнасьць пастаноў апошняга пленуму УсеЦСПС як для савецкага, так і для ўсяго міжнароднага прафруху.

Выканбюро вынесла пастанову, у якой ухваляе ўсе пастановы пленуму УсеЦСПС, а таксама і аслабаненьне ад абавязкаў членаў прэзыдыуму УсеЦСПС т.т. Томскага, Угарава, Ударава, Міхайлава, Гінзбурга, Карасьцелева, Яглома і Пэрфільева, а таксама ўвядзеньне ў склад прэзыдыуму УсеЦСПС т.т. Швэрніка, Аляксеева, Стрыеўскага і Семагіна. Для складаньня рэзалюцыі абрана камісія.

Выканбюро пастанавіла аслабаніць тав. Яглома ад абавязкаў члена сакратарыяту Прафінтэрну.

Мэты падарожжа Макданальда ў Амэрыку

НЬЮ-ЁРК, 13. Лёндэнскі карэспандэнт «Нью-Ёрк—Іўнінг-Пост» сьцьвярджае, што пытаньне аб адносінах з СССР Макданальд будзе разглядаць разам з амэрыканскім прэзыдэнтам Гувэрам у часе свайго падарожжа ў Вашынгтон. Паводле слоў карэспандэнта, Макданальд будзе старацца пераканаць Гувэра ў тым, што «ізаляваная Расія—галоўная небяспека для міжнароднага міру». Далей, той-жа карэспандэнт сьцьвярджае, што Макданальд мае намер адлажыць аднаўленьне дыплёматычных адносін Англіі з СССР да таго часу, пакуль ПАЗШ ня вырашаць дзейнічаць у тымжа напрамку.

На паседжаньні ў панядзелак, Макданальд, грунтуючыся на гэтай магчымасьці, пераканаў сваіх таварышоў па габінэту адлажыць вырашэньня па пытаньні аб СССР да свайго звароту з Вашынгтону. Карэспандэнт дадае, што Макданальд хоча ўзяць на сябе ролю пасярэдніка паміж СССР і капіталістычным сьветам, разьлічваючы гэтым «зрабіць уплыў на расійскі камунізм, зрабіць яго больш умераным».

ЛЁНДАН, 12. Дыплёматычны карэспандэнт «Дэйлі Тэлеграф» панярэджвае, што ад падарожжа Макданальда ў Вашынгтон ня трэба чакаць згоды на сутнасьці пытаньня ў марскім разбраеньні. Па думцы газэт, гэта падарожжа можа прывесьці толькі да прынцыповае згоды аб вызначэньні тэрміну адпаведнае канфэрэнцыі і да стварэньня агульнае базы для дыскусіі.

КАМУНІСТЫ ПАШЫН ЗНАХОДЗІЦЦА Ў ВАРШАЎСКАЙ ТУРМЕ

РЫГА, 6. Атрыманы весткі, што камуністы Пашын, якого латвійскія ўлады выдалі Польшчы, знаходзіцца зараз у Варшаўскай турме «Павіяк». Тав. Пашын пасаджан у аддзяленьне для крыміналістых і знаходзіцца ва ўмовах суровае ізаляцыі.

Сацыял-цэргібэлі рыхтуюць забарону кампартыі

БЭРЛІН, 11. Сацыял-дэмакратычны міністр унутраных спраў Зэвэрынг заявіў гэтым днямі ў рэйхстагу, што каліцыйны ўрад наважыў унесьці ў рэйхстаг законапраект аб палітычных арганізацыях, распрацаваны яшчэ ўрадам буржуазнага блёку.

Гэты законапраект, які нават урад буржуазнага блёку не адважыўся ўнесьці ў свой час у рэйхстаг, цалкам накіроўвае супроць Нямецкае камуністычнае партыі, паколькі прадугледжвае, што кожная палітычная арганізацыя можа быць распушчана і забаронена, калі «мэты і паводзіны яе супярэчаць законадаўству». Паводле законапраекту ўсе новаўтворныя палітычныя арганізацыі павінны на працягу 2-х тыдняў прадставіць свой статут і сьпіс членаў адпаведнай паліцэйскай управе. Сходы пад адкрытым небам могуць склікацца толькі пасьля адпаведнае заявы ў паліцэйскую ўправу, ня менш як за 48 гадзін да скліканьня. Паліцыя мае права забараняць падобныя сходы «пры наліччы непасрэднае пагрозы для грамадзкагапарадку».

2.000 мэксыканскіх студэнтаў захапілі будынак унівэрсытэту

НЬЮ-ЁРК, 12. Як паведамляюць з Мэксыко, 2.000 студэнтаў занялі будынак нацыянальнага унівэрсытэту, вывесілі на ім чырвоны сьцяг і забралі прафэсароў у якасьці заложнікаў, патрабуючы адстаўкі рэктара. Паліцыя не перашкаджала дэманстрантам.

Студэнцкі рух пачаўся месяц таму назад у выглядзе пратэсту супроць сыстэмы штомесячных экзаменаў.

РАБОТУ УСТАНОЎ ПРЫСТАСАВАЦЬ ДА ПАТРЭБ РАБОЧЫХ

Ніякіх паседжаньняў у першыя чатыры гадзіны.—Спэцыяльныя дні і гадзіны прыёму наведвальнікаў.—Два разы на тыдзень пачынаць работу з другое паловы дня

ПАСТАНОВА НК РСІ СССР

МАСКВА, 13. Калегія НК РСІ СССР, абмеркаваўшы пытаньне аб узьняцьці прадукцыйнасьці працы ў дзяржустановах і палепшаньні абслугоўваньня імі рабочых, прызнала патрэбным правесьці ў жыцьцё наступнае мерапрыемства: усім дзяржаўным установам павінна быць забаронена наладжваць якія-б там ні было паседжаньні і нарады ў першыя чатыры гадзіны рабочага часу. Забарона гэта не павінна дакранацца такіх устаноў, апэрацыйная работа якіх ажыцьцяўляецца выключна на паседжаньнях або нарадах.

Ва ўсіх установах вызначаюцца спэцыяльныя дні і гадзіны прыёму наведвальнікаў кіруючымі працаўнікамі гэтых устаноў. У гадзіны прыёму наведвальнікаў, гэтым асобам павінен быць забаронен удзел ва ўсякіх паседжаньнях і нарадах і прыём супрацоўнікаў свае установы.

Для таго, каб рабочыя мелі магчымасьць наведваць установы, трэба, каб два разы на тыдзень усе ўстановы пачыналі сваю работу з другое паловы дня, пры захаваньні нармальнага рабочага часу. Гэта пастанова НК РСІ СССР падана на разгляд СНК СССР.

УФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ

ПРЫГАВОРЫ УКРАІНЦАЎ ДА КАРЫ СЬМЕРЦЮ

ВАРШАВА, 13. Вярхоўны суд зацьвердзіў прыгавор Львоўскага акруговага суду, якім двое украінцаў Вержбіцкі і Аўтаманчук, што абвінавачваліся ў забойстве папячыцеля Львоўскае навучальнае акругі, былі прысуджаны першы да кары сьмерцю, а другі да 30 год катаргі. Гэты працэс прайшоў ужо тры інстанцыі і застаецца толькі адно—літасьць прэзыдэнта, калі ён знойдзе патрэбным гэта зрабіць.

РАЗГОН ЗЬЕЗДУ ВАРШАЎСКІХ БОЛЬНІЧНЫХ КАС

ВАРШАВА, 13. Згодна загаду міністра працы, распушчан акруговы зьезд варшаўскіх больнічных кас, што адкрыўся ўчора ў Варшаве. Разгон зьезду ўчынен без захаваньня хоць-бы мінімальных норм законнасьці. Зьезд больнічных кас адбываўся штогод і легальнасьць яго бяз усякае падазронасьці, тым больш, што ім кіравала ППС. Таму гэты загад можна разглядаць, як паход ураду супроць ППС.

УРАД ПАТУРАЕ ПАГРОМШЧЫКАМ

ВАРШАВА, 12. Польскае студэнцтва Львову спыніла забастоўку. Частка студэнтаў, якія прымалі ўдзел у яўрэйскім пагроме і за гэта арыштаваны, будуць выпушчаны.

АРЫШТЫ СЯРОД ВАЙСКОЎЦАЎ

ВАРШАВА, 12. Як паведамляюць газэты, у Кракаве арыштавана некалькі камуністых. Сярод іх жонка камдэпутата Багінскага, які сядзіць у турме (па абвінавачаньні ў агітацыі сярод салдат). Апрача таго арыштаваны, як паведамляюць газэты, некалькі салдат, абвінавачаных у камуністычнай дзейнасьці.

ТОЛЬКІ „ГІРНІ--КАМГАР"

Гэраічная барацьба бамбэйскіх тэкстыльшчыкаў.

Усеагульная забастоўка тэкстыльшчыкаў у Бамбэі пачалася 26 красавіка. 130.000 рабочых, якія ня маюць ніякіх зьберажэньняў, не атрымліваюць ні капейкі дапамогі і страшэнна галадуюць, ужо восьмы тыдзень гэраічна супраціўляюцца фабрыкантам, паліцыі і правадырам меншавіцкіх саюзаў.

Забастоўка была абвешчана таму, што ткачоў пераялі з двух варштатаў на тры. У выніку такое рацыяналізацыі некалькі тысяч рабочых былі звольнены, а для тых, хто застаўся на рабоце, зарплату не павялічылі. Спачатку забастоўшчыкі высунулі патрабаваньні: павысіць зарплату і прыняць на работу звольненых. **Потым бастуючыя патрабавалі яшчэ прызнаць іх фабкомы і новы рэвалюцыйны саюз—«Гірні-камгар».**

За выключэньнем некалькіх дробных фабрык на акраінах гораду ў Бамбэі бастуюць усе тэкстыльныя прадпрыемствы. **Забастоўшчыкі праяўляюць дружную з'арганізаванасьць. Штрэйкбрэхэраў няма.** Нават арышт усіх кіраўнікоў саюзу і забастовачнага камітэту не пахіснуў радоў бастуючых. **Арыштаваныя былі заменены рабочымі ад варштату, часамі няпісьменнымі, але затое вытрыманымі таварышамі.**

Старшыня і сакратар бамбэйскага меншавіцкага саюзу тэкстыльшчыкаў прабавалі ўгаварыць рабочых вярнуцца да сваіх варштатаў. Гэтыя ўгаворы ні да чаго не прывялі. Рабочыя не згадзіліся таксама на пасярэдніцтва вядомага правадыра нацыянальнага індыйскага руху Гандзі і старшыні ўсеіндыйскага аб'яднаньня прафсаюзу Нэру.

— У нас няма давер'я да Гандзі і Нэру. Мы хочам самі, бяз іх праз наш рэвалюцыйны саюз дагаварвацца з фабрыкантамі,—заявілі бамбэйскія тэкстыльшчыкі.

Ні арышты кіраўнікоў, ні расстрэлы бастуючых, ні ўгаворы меншавікоў ня могуць зламаць супраціўленьня бамбэйскіх тэкстыльшчыкаў. Яны цьвёрда згуртаваліся вакол «Гірні-камгар», яму аднаму давяраюць. У гэтым іх моц.

„Няхай жыве пралетарская рэвалюцыя"

ЛЁНДАН, 12. Агэнцтва Рэйтэр паведамляе з Дэлі (Індыя):

«Суд прыгаварыў да бястэрміновае катаргі двух індусаў, якія былі арыштаваны ў красавіку ў сувязі з выбухам бомб у індыйскім заканадаўчым сходзе. Выслухаўшы прысуд, асужаныя ўсклікнулі: «Няхай жыве пралетарская рэвалюцыя».

„Абрысы вобразу Леніна" у Індыі

«Індыя жыве палітычна ў мякнім сьвятле вучэньня Гандзі. Аднак, цень, які стварае кантрасты, ужо пачынае прымаць вострыя абрысы вобразу Леніна». Так піша бамбэйскі карэспандэнт газэты «Бэрлінэр Тагеблят

НА ЗДЫМКУ: падпольная індыйская газэта з партрэтам Ільича

Працэс 31 дзеяча індыйскага рабочага руху

ЛЁНДАН, 12. У Міруце (Індыя) пачаўся працэс 31 дзеяча індыйскага рабочага руху, якія былі арыштаваны ў сакавіку. Справа слухаецца ў асобным судовым прысутстве. Абвінавачаньне прад'яўлена па 121 арт. крым. кодэксу і сфармулявана, як спроба гвалтоўнае зьмены існуючага ладу. Суд ахоўваецца навялічаным атрадам паліцыі. Абвінавачаныя былі дастаўлены на двух грузавіках. Пры ўваходзе ў памяшканьне суду, у самой залі, яны ўсклікнулі: «Прэч імпэрыялізм, няхай жыве рэвалюцыя».

Усе абвінавачаныя маюць чырвоныя значкі з сярпом і молатам. Абвінавачаныя адпраўлены Макданальду тэлеграму, у якой яны патрабуюць скасаваньня законадаўства, накіраванага супроць працоўных Індыі.

Кампанія па перавыбарах у сельска-гаспадарчай каапэрацыі ідзе нездавальняючым тэмпам

Трэба ўзмацніць кіраўніцтва кампаніяй

Ня гледзячы на рад даных сваячасова дырэктыў, па спэцыяльны ліст ЦК КП(б)Б аб перавыбарах сельска-гаспадарчай каапэрацыі, па некаторых акругах (напрыклад, Менскай, Аршанскай) да гэтага часу перавыбары, як палітычная кампанія, якая мае асаблівае значэньне ў гэтым годзе ў сувязі з калектывізацыяй сельскай гаспадаркі і настойлівай неабходнасьцю ўзмацніць кіруючыя органы каапэрацыі,—яшчэ не разгарнулася, як трэба.

Пленум Аршанскага акругкому (11-га чэрвеня) у сваёй пастанове па дакладу бюро акругкому адзначыў і зьвярнуў увагу ўсёй партарганізацыі: а) на слабое кіраўніцтва і ўвагу праходзячым перавыбарам органаў сельска-гасп

Уральская нафта

Аб тым, што ў самым цэнтры уральскага мэталюргічнага раёну ёсьць залежы нафты, вучоныя-геалёгі думалі ўжо даўно. Недарма геалёгічны камітэт і галоўгортап яшчэ 2 гады таму назад выцянулі перад саветам працы і абароны праект арганізацыі спэцыяльнай нафтазьвядчай канторы для пошукаў нафты на Урале. Недахват сродкаў перашкодзіў тады ажыцьцявіць гэтае мерапрыемства.

Прасьвідраваная прабоіна № 1 у Верхня-Чусаўскіх гарадках, што зрабілася з гэтага часу гістарычнай і закладзеная ўвосень мінулага году, мела на мэце глыбокую разьведку ня нафты, а калійнай солі. Закладчай какучы, гэтыя прабоіна павінна была вызначыць межы пашырэньня калійных месцанараджэньняў Паўночнага Уралу. Сьвідраваньне сыстэматычна прасоўвалася наперад, і геалёгі не знаходзілі ніякіх аднак солі. Але вось прайшлі 330 мэтраў і ў пчылінах цьвёрдай пароды пачалі трапляць невялікія пчыліны з вельмі слабым пахам нафты. У сярэдзіне красавіка, г. зн. паўтара месяца таму назад, калёнкі гэтых парод з незначнымі пчылінамі і слабым пахам нафты былі адпраўлены у Ленінград да праф. Прэабражэнскага, які па гэтых слабых адзнаках гады ўжо адзначыў, што на Ўрале ёсьць нафта.

З таго часу падсі ідуць шпаркім тэмпам. 28 красавіка прафэсару Прэабражэнскаму была пасланa ўжо тэлеграма, што сьвідраваньне праходзіць пузырыстыя пароды, пачалося вылучэньне газа і што сабрана ўжо некалькі цудоў нафты, якая выплывае праз ваду наверх.

Яшчэ вестка аб тым, што праф. Прэабражэнскі атрымаў з Уралу каменную калёнку са слабым нафтавым пахам, выклікала ў колах ВСНГ надзвычайную цікавасьць, а 8 мая прэзыдыум ВСНГ пастанавіў ужо пачаць выведку Ўральскай нафты ў шырокім маштабе, зрабіць рад новых прабоін і асыгнаваць на гэтую справу мільён рублёў. Разьніў ракі Чусавой прыпыніў работы на прабоіне на 2 тыдні, але, як толькі вада зьменшылася, работы адналіся зноў, і ўжо 22 мая Ўральская нафта пачала біць фэнтанам.

Такая гісторыя першай нафтавай прабоіны на Урале, першай прабоіны, за якой у бліжэйшыя дні і тыдні будзе і 5 іншых, а ў будучым годзе—да трох дзесяткаў новых прабоін. На мінула яшчэ і двух месяцаў з таго часу, як слабы пах нафты выклікаў нязмоўныя здагадкі аб наяўнасьці незлічоных нафтавых багацьцяў на Урале, а цяпер ужо раён Верхня-Чусаўскіх гарадкоў перажывае свяасаблівую «нафтавую гарачку». У раён адпраўлены з далёкага Грознага вагоны з абсталяваньнем і інструмантамі, пераводзяцца кваліфікаваныя рабочыя-нафтавікі, завозяцца прамысловыя тавары і прадукты, вядуцца досьледы па пабудове чыгункі ад ст. Камарыхінская або Валежная да Верхня-Чусаўскіх гарадкоў, будуюцца нафтасховы, бо першая прабоіна можа ўжо даваць да 50 тон нафты ў суткі (ня зрэшта для пачатку!) і г. д. і г. д.

Але гэта дзелавая гарачка, гэты чыста амэрыканскі размах пакуль што натыкаецца на надзвычайную аддаленасьць і адрэзанасьць новага ўральскага порду ад знадворнага сьвету. Калі праф. Прэабражанскі і работнікі, якія ехалі разам з ім у Верхня-Чусаўскія гарадкі, ім прышлося суткамі чакаць цягніка на ст. Валежная і, чакаючы пераправы, начаваць ля вогнішчаў на беразе Чусавой. Важнейшыя тэрміновыя ўрадовыя тэлеграмы ідуць з Верхня-Чусаўскіх гарадкоў у Пэрм і Маскву 3—4 суткі.

Гэтым становішчам пакуль што карыстаюцца кулакі, якія, аднуўшы пажыву, паднялі цэны на малако, яйкі і іншыя прадукты. За фурманкі бяруць даражэй у тры разы. Кут у хаце расцінываюць, як добры нумар гасьцініцы. Сякія-такія вясковыя спэкулянты прыязджаюцца ўжо да старых, гнілых пабудоў, разьмешчаных у непасрэднай блізасьці да нафтавай прабоіны. Гэтыя пабудовы будуць знесены, і кулакі пастанова імкнуцца скупіць хаты за танную цану, каб потым садраць за іх з дзяркамі па павышанай цане. Гэтым апошнім адразу-ж будзе пакладзены канец, як толькі будуць наладжаны зручныя шляхі зносін, якія дазволяць-б наладзіць рэгулярнае забесьпячэньне нафтавага раёну. Што гэтыя шляхі зносін будуць арганізаваны ў хуткім часе, відаць хаця-б з таго, што пабудова чыгуначнай лініі да нафтапромыслаў працягнецца толькі 5 месяцаў.

Пакуль што, мяркуючы па агульным геалёгічным будаваньні Чусаўскага раёну, месцанараджэньні ўральскай нафты займаюць плошчу ў 18.000 кв. кілёмэтраў (300 клм. даўжыні і 60 клм. шырыні) і маюць нафты ад 300 да 325 мільёнаў тон.

Гэта вялічэзнае месцанараджэньне зусім зьменіць твар Уралу і будзе мець вялікае значэньне для ўсяе гаспадарчі Савецкага Саюзу. Перш за ўсё Ўральская мэталюргія атрымлівае новую энэргетычную базу ў выглядзе таннай нафты, якую ня прыдзецца дастаўляць за некалькі тысяч кілёмэтраў. Ўральская нафтай можна будзе забясьпечыць і ўзрастаючую прамысловасьць Сібіры. Ўральская нафта вызваліць частку багінскай і грозьненскай нафты для экспарту. Нарэшце, уральская нафта зьявіцца сырцом для разьвіцьця нафтаперагоннай прамысловасьці на Урале.

Адным словам—уральская нафта адыграе вялізарную ролю ў тэй грандыёзнай рабоце, якая называецца індустрыялізацыяй Савецкага Саюзу.

Н. Г.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Кожная ячэйка павінна праверыць сябе, як яна падрыхтавалася да генэральнай чысткі

Ачысьціўшы свае рады ад чужых элемэнтаў, якія разлажыліся і абюракраціліся,—партыя з большай пасьпяховасьцю будзе ажыцьцяўляць задачы сацыялістычнага будаўніцтва

Ці ўсё зроблена?

Ці ўсё зроблена для забесьпячэньня пасьпяховага правядзеньня генэральнай праверкі і чысткі партыйных радоў? Вось пытаньне, якое павінна перад сабою паставіць кожная арганізацыя, кожны калектыў і ячэйка. Рад фактаў паказвае, што некаторыя з асобных райпартарганізацый і ячэек правялі да некаторай ступені слабую падрыхтоўку, што ў некаторых арганізацыях і ячэйках у гэтых адносінах ёсьць рад слабых месц.

Гомельская «Полесская Правда» у артыкуле «Недахваты ў рабоце па падрыхтоўцы да чысткі» піша:

Заўважваецца некаторы халадок да гэтае важнейшае справы. За апошні час менш за ўсё гаворыць аб чысткі. Напрыклад, на мінулых партканфэрэнцыях Новабеліцкага і Залінейнага раёнаў і на радзе перавыбарных сходаў ячэек пытаньню падыходзячай чысткі ўдзялялася вельмі мала ўвагі. На акруговай нарадзе сакратароў сельячэек, якая нядаўна скончылася, пытаньні, зьвязаныя з чысткай партыі і савецкага апарату, таксама займалі найменшае месца. Няўжо задачы і мэты чысткі ўсімі настолькі добра ўсьвядомлены, што няма аб чым гаварыць?

Зусім не. Матар'ялы, якія ў нас ёсьць, гавораць далёка аб невыстарчальнай папулярызацыі значэньня чысткі сярод партыйцаў, беспартыйных рабочых і сялянства. У радзе месц пыракія масы яшчэ ня прыцягнуты да абгаварэньня пытаньняў чысткі. Больш таго—значная частка адказных таварышоў не ўсьвядоміла задач чысткі і парадку правядзеньня яе. Аб гэтым сьведчаць запытаньні, даныя некаторымі сакратарамі вясковых я[illegible] мы павінны [illegible]ісьціць?» «Ці трэба чысьціць кулацкіх і папоўскіх [illegible], якія адмаўляюцца ісьці ў калгасы, здаюць у арэнду свае дамы»? У некаторых ячэйках паасобныя члены партыі прадстаўлялі чыстку, як ачышчэньне партыі ад на літычна слабя разьвітых таварышоў. Адсюль падача заяў аб выхадзе з партыі (яч. «Чырвоны Хэмік»).

Зусім мала зроблена ў адносінах сапраўднага выяўленьня сацыяльна-чужых нам, тых, хто абюракрацілся ўсіх тых «камуністых», ад якіх партыя павінна ачысьціцца. У друкаваных і насьценных газэтах больш за ўсё ад значаюцца паасобныя ўчынкі камуністых, прытым часта такія, якія былі зроблены некалькі год таму назад. Такім чынам, ня ставяцца ў аснову клясавыя задачы чысткі, што павінна вызначыць галоўнейшым мярылам пры ацэнцы партыйнасьці таго або іншага камуністага.

Прыходзіцца адзначыць недапушчальныя адносіны некаторых райкомаў да складаньня характарыстык на ячэйкі.

Што, напрыклад, гаворыць такая характарыстыка ячэйкі, даная Веткаўскім райкомам: «Арганізавана ў студзені 1929 г., ня досыць арганізацыйна ўзмацнілася. Малады склад ячэйкі. На рабоце сябе яшчэ не праявіла. Агульнае становішча здаровае».

Або вось характарыстыка аднэй з ячэек, даная Буда-Кашалёўскім райкомам: «Ячэйка рабочая; членаў—8, кандыдатаў—8. Ячэйка вытрыманая. Паліпадрыхтоўка невыстарчальная. Ёсьць моманты недысцыплінаванасьці (ня выконваюць партнарадаў, не зьяўляюцца на партсходы). Ячэйка наогул аўтарытэтная. Ёсьць нездаровыя зьявішчы (п'янства)». Здаецца, камэнтары тут лішнія: ёсьць нездаровыя зьявішчы, недысцыплінаванасьць, а наогул ячэйка вытрыманая і аўтарытэтная!

Чачэрскі райком на 2 ячэйкі дае такую характарыстыку: «У рабоце сябе яшчэ не пасьпелі праявіць. Такім чынам, цяжка выявіць як станоўчыя, так і адмоўныя бакі». Няўжо райком аб маладых ячэйках ня можа сказаць штонебудзь пэўнае? Што могуць такія характарыстыкі даць камісіям на чысткі? А вось характарыстыка, даная Брагінскім райкомам: «З агульнымі задачамі спраўляецца. Арыентыроўка правільная. Ёсьць недахваты ў паасобных членаў партыі. Ухіл управа. Ячэйка слаба рэагуе. Аўтарытэтам карыстаецца, да налітасьветы нядбайна адносіцца. Работа з беднатой ёсьць і ёсьць пэрспэктывы росту ячэйкі».

З гэтага ясна, што паасобныя арганізацыі далёка ня сур'ёзна адносяцца да работы на растлумачэньні задач і складаньні агульных характарыстык паасобных ячэек. Гэта пацьвярджаецца і тымі агульнымі рэзалюцыямі, якія ўхвалены некаторымі органамі па дакладах аб чысткі. Напрыклад Гомельскі райком пастанаўляе: «Запрапанаваць ячэйкам, дзе гэта пытаньне не прапрацоўвалася, паставіць яго на адкрытым сходзе». Чачэрскі райпартсход ухваляе наступную пастанову: «Даклад прыняць да ведама і кіраўніцтва. Ячэйкам падрыхтаваць матар'ял да чысткі партыі і прапрацаваць яго на сходзе». У ходзе падрыхтоўчай работы выяўлен і рад іншых памылак: дача характарыстык на адкрытых сходах (Брагінск. мясц. яч.), выпадак, калі бюро ячэйкі само сабе дало характарыстыку (Хойніцкі раён). У адным з парткалектываў вайсковых часьцей у камуністых яшчэ перад чысткай адабралі партбілеты.

Трэба спыніцца на адным надзвычайна важным пытаньні, зьвязаным з чысткай—гэта аб пранагандзе партыйнасьці і ўзмацненьні вярбоўкі ў партыю. У гэтых адносінах зусім мала зроблена. Мы заўважваем паслабленьне тэмпу росту раду арганізацый.

Паданыя факты красамоўна гаворыць аб тым, што ў падрыхтоўчай рабоце да чысткі ёсьць рад прабелаў. Зараз, калі ідзе праверка кіруючага складу КП(б)Б, што працуе ў акруговых арганізацыях, да часу, калі пачнецца праверка ў ячэйках, нізавым партарганізацыям трэба дасканала праверыць: ці ўсё зроблена для таго, каб як мага з большым посьпехам правесьці гэтую важнейшую партыйную работу. Праверыць і направіць упушчэньні—вось асноўнае на сёньняшні дзень для партарганізацый і ячэек.

Актыўна, пад знакам самакрытыкі і самаправеркі

(Раённая канфэрэнцыя Віцебскай арганізацыі КП(б)Б

Скончыла сваю работу чарговая раённая канфэрэнцыя Віцебскай арганізацыі КП(б)Б.

У рабоце канфэрэнцыі прымала ўдзел звыш 300 дэлегатаў.

У парадку дня канфэрэнцыі стаяла толькі адно пытаньне—справаздача раённага камітэту КП(б)Б.

Барацьба з праўленьнямі правага ўхілу і прымірэнцтвам, сацыялістычнае спаборніцтва, рацыяналізацыя вытворчасьці, гаспадарчае будаўніцтва—вось асноўныя пытаньні, над вырашэньнем якіх працавалі раённы камітэт і арганізацыя.

У сваім дакладзе сакратар раённага камітэту тав. ІГНАТОВІЧ спыніўся на посьпехах і недахопах арганізацыі на фронце гаспадарчага будаўніцтва.

Раён індустрыялізуецца. Шпаркім тэмпам растуць кадры рабочае клясы. Колькасьць рабочых на заводзе «ЧЫРВОНЫ МЭТАЛІСТЫ» за справаздачны пэрыяд павялічылася на 3 проц., на фабрыцы «ПРАФІНТЭРН»—на 8 проц., друкарні «КАМІНТЭРН»—13 процантаў.

На фабрыцы па выбаре ложкаў лік рабочых вырас на 100 процантаў.

На радзе прадпрыемстваў праведзена рацыяналізацыя. Пераабсталяваны сілавыя ўстаноўкі. Устаноўлены новыя машыны і варштаты. На дражджавым заводзе праведзена поўнае капітальнае пераабсталяваньне.

Усе заводы і фабрыкі раёну ўступілі ў сацыялістычнае спаборніцтва.

Факты і лічбы гавораць аб тым, што спаборніцтва прынесла пэўную станоўчыя вынікі. Прадукцыйнасьць працы на мэталюргічным заводзе «Чырвоны Мэталісты» павялічылася на 18 проц., на макарачнай фабрыцы—на 15 проц.

Рабочыя друкарні «Камінтэрн» павялічылі прадукцыйнасьць працы на 23,75 проц. Горш са зьніжэньнем сабекошту і адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў.

Арганізацыя дала самы рашучы адпор правым апартуністым і прымірэнцам. Арганізацыя правяла вялікую работу па растлумачэньні энтузіязму і сутнасьці правага ўхілу і прымірэнцтва, па барацьбе з канкрэтнымі праўленьнямі гэтага ўхілу.

Сярод некаторых асобных членаў арганізацыі яшчэ да гэтага часу існуюць праваўклонісцкія, прымірэнчыя настроі. Некаторыя камуністы, што працуюць на вытворчасьці, плятуцца ў хвасьце адсталых груп рабочых, не праяўляюць цьвёрдасьці і рашучасьці пры вырашэньні пытаньняў вытворчасьці, кармаваньня працы і перагляду расцэнак.

У спрэчках па дакладу раённага камітэту выказалася 25 чалавек. Дэлегаты, адзначаючы недахопы ў рабоце, спыняліся на далейшых задачах арганізацыі.

Дэлегаты паказвалі, што партыйныя ячэйкі павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу на вярбоўку ў партыю беспартыйных рабочых і работніц.

Далейшая работа арганізацыі павінна праходзіць пад знакам рашучай барацьбы з панікёрамі і капітулянтамі, з канкрэтнымі праяўленьнямі правага ўхілу ў практычнай рабоце і прымірэнцтва, пад знакам жорсткага выкананьня прамфінпляну.

* * *

Канфэрэнцыя абрала раённы камітэт у складзе 29 членаў і 15 кандыдатаў і раённую партыйную тройку ў складзе трох чалавек.

Праверка у лягерах

12-га чэрвеня ў лягерах Ня-скай кавалерыйскай дывізіі адбыўся чарговы куставы партсход.

На сходзе былі праверены т. т.: ВІЛЬКАВРЫНСКІ, ЗЬМІТРЫЕНКА, ГРЫШАНОЎ, УКОЛАЎ, ЯКІМОВІЧ, МІКЛІН, МАСКАЛЁЎ, ВОЛЬСКІ, якія былі вылучаны ў склад праверачных камісій.

Праверку праводзіла камісія ў складзе т. т. ДАМБРОЎСКАГА, НОВІКАВА і САМОЙЛАВА.

Сход прайшоў пад знакам антыўчасьці і самакрытыкі. У праверцы прымалі ўдзел беспартыйныя чырвонаармейцы і камандзіры.

Правільна расставіць партыйныя сілы

АБ ПАРТНАГРУЗКАХ У ВЯСКОВЫХ ПАРТ'ЯЧЭЙКАХ

Пытаньне аб уцягненьні вясковых камуністых у актыўную партыйную работу набывае ў даны момант вялікае значэньне. У сёньняшніх умовах немагчыма партработу ажыцьцяўляць выключна пры апараты: рэйкомы і бюро ячэек. Складанасьць высунутых 16-й партканфэрэнцыяй задач перад вясковай часткай нашай партыі патрабуе правільнай расстаноўкі партыйных сіл з тым, каб забясьпечыць усе вучасткі работы на вёсцы партыйным кіраўніцтвам.

Да апошняга часу ва многіх вясковых ячэйках існуе такі парадак: усю цяжкасьць партработы ўскладаюць на аднаго, больш-менш падрыхтаванага таварыша, часьцей усяго самога сакратара ячэйкі. Як характэрны прыклад няправільнага, бязглуздага разьмеркаваньня партабавязкаў, можна ўзяць Кузьмініцкую і Цэрахаўскую ячэйкі, Гомельскае акругі. Сакратар Кузьмініцкай парт'ячэйкі зьяўляецца старшынёй сельсавету, вясковым партарганізатарам, кіраўніком жаночага сходу, сакратаром ячэйкі: МОПР, Асоавіяхім, бязбожнікаў, упоўнаважаным на рабоце сярод беднаты, ён-жа загадчык хатай-чытальняй. Другі таварыш мае толькі адзін абавязак партарганізатара, іншыя-ж 5 партыйцаў зусім не нагружаны ніякай работай.

Некаторыя парт'ячэйкі (Перарастаўская і інш.) робяць нерагіб у другі бок, яны імкнуцца даць кожнаму партыйцу нагрузку. Але гэта робіцца часьцей за ўсё для таго, каб фармальне не адставаць ад лёзунгу: «няма члена партыі без партыйных абавязкаў». У большасьці партнагрузка ў такіх выпадках заключаецца ў зьбіраньні членскіх узносаў, пісаньні пратаколаў, дзяжурстве ў пардоме і г. д. Найбольш сур'ёзнай работы радавым партыйцам не даверяюць.

Такое скарыстаньне і выхаваньне радавых партыйцаў на практычнай рабоце ліквуды нявартае, яно не адпавядае дырэктывам партыі і тым вялікім задачам, што стаяць перад кожным радавым партыйцам на вёсцы.

Высоўваючы пытаньне аб уцягненьні ўсіх вясковых партыйцаў у практычную партработу, я канкрэтна раю наступнае:

Увесьці абавязковае выкананьне кожным членам і кандыдатам партыі належнай партработы, прычым у гэтым пытаньні трэба зьвяшчыць баязьлівасьць і даручаць радавым партыйцам сур'ёзную і адказную работу. Пры належнай дапамозе больш падрыхтаваных і практычных таварышоў і добрым кіраўніцтве бюро ячэйкі радавы партыец навучыцца працаваць.

Пры разьмеркаваньні партабавязкаў перш за ўсё трэба абдумаць, на якой рабоце мэтазгодна скарыстаць таго ці іншага таварыша.

Перад разьмеркаваньнем абавязкаў трэба перш за ўсё высьветліць усе выгляды работы дзе сапраўды патрэбны партыйныя сілы.

Трэба весьці строгі падлік і кантроль над выкананьня тым ці іншым камуністым даручанай яму работы. І, нарэшце, кожны партыец павінен свячасова рабіць справаздачы аб праробленай рабоце. Такія справаздачы можна заслухоўваць на бюро ячэйкі, ці ставіць на агульных сходах.

М. СЬВЯТЛОВІЧ.

Недапушчальная бязьдзейнасьць

(Рагінская ячэйка КП(б)Б, Буда-Кашалёўскі раён, Гомельскае акругі)

На тэрыторыі, якую сваім абслугоўваньнем ахапляе Рагінская парт'ячэйка, ёсьць значная колькасьць рабочых савецкай гаспадаркі, вясковага актыву з беднаты, батракоў і дэмабілізаваных чырвонаармейцаў... Але ўся бяда ў тым, што ячэйка гэтага актыву не выкарыстоўвае, ня робіць праз яго адпаведнага ўплыву на масы. Ячэйка адчуваецца слаба, масавай, культурнай работы сярод сялян не вядзе, і таму мы ў цэнтры сельсавету ў ёсьць Рагінь пагледзем такі брыдкі факт. Пагінішчытыве кулакоў будуецца царква, кулацтва ў гэтай справе выкарыстоўвае адсталасьць пасельніцтва, а ячэйка не процістаўляе гэтаму сваёй масава-культурнай работы, не выкрывае перад бядняцкім і серадняцкімі масамі кулацкіх спраў, ня згуртоўвае бедноты наўкола гаспадаркі.

Чаму-ж гэта так?

Справа ў тым, што ячэйка да некаторай ступені засьмечана кулацкім элемэнтам, што многія партыйцы сваімі паводзінамі дыскрэдытуюць ячэйку і ўсю партыю.

Вось прыклад з членам партыі Новікавым Кірылам. Ён, будучы старшынёю праўленьня спажывецкага таварыства, спэкуляваў розным рэчамі, растраціў 400 руб.

І што-ж сталася з Новікавым?

Ён ні ў партыйным, ні ў савецкім парадку да адказнасьці ня быў прыцягнуты, а быў пераведзены на работу ў раён, па больш адказную пасаду. Ячэйка справу Новікава з растратай замяла...

Другі прыклад. Прыказчык спажывецкага таварыства, кандыдат партыі, Чэньнякоў Паўлюк увесь час ашукваў сялян на базе прыёму розных тавараў. Сяляне рашуча патрабавалі, каб яго зьнялі з работы, і праўленьне яго зьняло. Але праз некаторы час ён зноў апынуўся на рабоце, ён зноў абкрадвае каапэрацыю. Сяляне выкрылі яго пакражу падэшвы і паведамілі аб гэтым ячэйку... а справа ня рухаецца.

І, нарэшце, падамо яшчэ адзін прыклад. **Тарбянкоў Антось**, член партыі, працуе старшынёй сельсавету. Бацька яго перны ўдзельнік і ініцыятар пабудовы царквы. Сам-жа Тарбянкоў жыве ў аднэй хаце з бацькам. Гэты камуністы ні разу не выступаў супроць кулакоў, ён з усімі хоча быць добрым.

— Чаго варты такі камуністы? Ці пойдзе за ім беднота, маса?

Трэба рашучым нападкам аздаровіць Рагінскую ячэйку, выкінуць з яе радоў тых, кампрамэтуючь партыю.

П. М.

Усебеларуская канфэрэнцыя камсамолу

Учора раніцой канфэрэнцыя заслухала даклад т. Каплана аб рабоце прафсаюзаў БССР сярод моладзі.

Дакладчык адзначыў слабы ўдзел рабочай моладзі ў прафрабоце. Лічбы даюць выразны малюнак памяншэньня актыўнасьці моладзі: у 1927 г. моладзь складала 9,6 проц. усяго прафактыву ў ЦП і акрадпрадзяленьнях саюзаў, у 1928 г. процант моладзі ў складзе прафактыву зьнізіўся да 6,6 проц. У ФЗМК і камісіях пры іх моладзь у 1297 г. складала 14,8 проц., у 1928 г.—12,9 проц.

Удзел моладзі ў масавай рабоце на прадпрыемствах таксама пакідае чакаць лепшага. Толькі 40-50 проц. моладзі прымае ўдзел у агульных рабочых сходах, вельмі мала моладзі працуе ў гуртках і розных арганізацыях на заводах і фабрыках.

Трэба дабіцца,—кажа т. Каплан,—большага ўцягненьня моладзі ў прафработу, трэба, каб уся моладзь нікавілася прафработай на сваіх прадпрыемствах.

Сацыялістычнае спаборніцтва разгарнулася вельмі шырока сярод рабочых мас заводаў і фабрык БССР. Моладзь прымае актыўны ўдзел у спаборніцтвах і зараз. Ударныя брыгады моладзі даюць добрыя вынікі ў сэнсе ўздыму інімыятывы і энтузіязму рабочых.

Аднак, па некаторых прадпрыемствах сацыялістычнае спаборніцтва аслабла. Треба, каб рабочая моладзь гэтых прадпрыемстваў больш разгарнула сваю работу, арганізавала ударныя брыгады там, дзе іх яшчэ няма.

Некалькі слоў аб удзеле моладзі ў клюбнай рабоце. У 1927 г. моладзь складала 16 проц. клюбнага актыву, а ў 1928 гэты процант зьнізіўся да 13,5 проц. У гурткох пры клюбах у 1927 г. было моладзі 46,3 проц., у 1928 г.—44,4 проц.

Гэтыя лічбы гавораць аб тым, што актыўнасьць моладзі ў клюбнай рабоце зменшылася

Спыніўшыся на пытаньнях падрыхтоўкі кваліфікаванай рабочай сілы, тав. Каплан адзначыў, што паводле пяцігадовага пляну да канца пяцігодкі мяркуецца ўсю бронь-вучнёўства ахапіць школамі ФЗУ.

* * *

На гэтым-жа пасяджэньні быў заслуханы судаклад т. Джалюка і пачаліся спрэчкі па гэтых дакладах.

Г. С.

НА ПЛЕНУМЕ ЦСПСБ

Што выявіла абсьледваньне камісіі УсеЦСПС

Даклад інструктара УсеЦСПС тав. ФАЙНГОЛЬДА

Пленум заслухаў даклад тав. Файнгольда аб выніках абсьледваньня прафэсыянальнай работы ў Беларусі. У пачатку свайго дакладу тав. Файнгольд спыніўся на задачах, што ставіла перад сабой камісія УсеЦСПС. Мэта абсьледваньня—усебаковае азнаёмленьне і абсьледваньне работы прафсаюзаў Беларусі.

Уся работа па абсьледваньні насіла масавы характар. У гэтай рабоце удзельнічала каля 300 рабочых ад варштату.

— Мы,—кажа т. Файнгольд,—абсьледвалі Менскую, Бабруйскую і Віцебскую акругі. Вывады камісіі абмяркоўваліся на рабочых сходах.

Канчаткова вывады будуць разгледжаны і зацьверджаны УсеЦСПС. Што жа выявіла камісія?

* * *

Слабае месца у рабоце прафсаюзаў БССР—масавая работа. На гэтым фронце прафсаюзы маюць значныя недахопы. Вытворчыя нарады і камісіі працавалі дрэнна. Агляд вытворчых нарад зацягнуўся і праходзіў невыстарчальна. Сацыялістычнае спаборніцтва на радзе прадпрыемстваў праводзіцца фармальна. Адсутнічае дастатковая падрыхтоўка і сур'ёзны дзелавы падыход. Лепш абстаіць справа з калдагаворнай кампаніяй. Сваячасовае заключэньне калдагавароў і мабілізацыя грамадзкай думкі наўкола гэтай кампаніі сьведчаць аб тым, што прафсаюзы з сваімі задачамі справіліся. Невялічкая заўвага. Трэба шырэй разгарнуць работу па праверцы выкананьня калдагавароў.

Як ў нас праводзіцца масавая работа на заводах і фабрыках, на зьменах, у цэху, на рабочых сходах? Як мы выхоўваем кадры рабочых? Трэба проста сказаць—нездавальняючы. Вось факты. На бабруйскім фанерным заводзе заўком не абслугоўвае начную зьмену рабочых. На заводзе «Рухавік Рэвалюцыі» зусім няма цэхарганізацый. У гомельскіх галоўных чыгуначных майстэрнях за паўтара гады былі праведзены толькі дзьве справаздачы цэхбюро.

Агульныя сходы праводзіцца занадта часта. Павестка сходаў бывае няцікавай і перагружанай. Некалькі слоў аб росьце прафактыву. Актыў на працягу двух год па вестках ЦСПСБ павялічыўся толькі на адзін процант. Гэта зусім недастаткова.

* * *

Клюбы не разгарнулі у дастатковай меры культурна-выхаваўчай работы. Культурнае абслугоўваньне мас абмяжоўваецца пастаноўкай кіно-сэансаў. Палітурткі занялі. Колькасьць іх з кожным годам зьмяншаецца. Толькі 16 процантаў клюбных гурткоў працуе на бялмове. У бібліятэках мала папулярнай літаратуры. Нацыянальнай літаратуры амаль зусім няма. Прэзыдыум ЦСПСБ ня цікавіўся гэтым пытаньнем. Вось яшчэ характэрная рыса у клюбнай рабоце. Клюбы ня стварылі клюбнага актыву і нават ня ведаюць колькі у іх ёсьць членаў. У Віцебскім клюбе дрэвапрапоўшчыкаў лічыцца членамі клюбу 290 чалавек, а плоцяць членскія узносы толькі 6.

Трэба адзначыць, што прафсаюзы правялі вялікую работу па распаўсюджваньні пазыкі індустрыялізацыі, правядзеньні перавыбарчай кампаніі і г. д.

* * *

Вылучэньне рабочых ад варштату на работу у апараце ідзе больш-менш здавальняючым тэмпам. Кадры вылучэнцаў значна вырасьлі. Вылучэнцы поўнасьцю апраўдалі сябе. Разам з гэтым трэба падкрэсьліць, што і на гэтым вучастку работы ёсьць некаторыя недахопы. З вылучэнцамі ня праводзіцца сыстэматычная плянавая работа, не аказваецца ім практычная дапамога і г. д.

* * *

Потым тав. Файнгольд спыніўся на пытаньнях направы і самакрытыкі.

Дакладчык адзначыў, што прафсаюзы БССР маюць пэўныя дасягненьні ў правядзеньні нацыянальнай работы. Аднак, гэта ня значыць, што на дасягнутым можна супакоіцца. Трэба яшчэ больш разгарнуць інтэрнацыянальнае выхаваньне рабочых мас, яшчэ больш рашуча вясьці барацьбу з праяўленьнямі антысэмітызму і шавінізму.

* * *

Прафсаюзы поўнасьцю усьвядомілі вялікае палітычнае і практычнае значэньне самакрытыкі. Мы ня заўважылі выпадкаў грубага скажэньня лёзунгу самакрытыкі, яўнага парушэньня прынцыпаў дэмакратыі.

Не замазваць і дасягненьняў

Спрэчкі па дакладу тав. Файнгольда

На раніннім пасяджэньні 13-га чэрвеня разгарнуліся спрэчкі па дакладу тав. Файнгольда аб абсьледваньні прафсаюзных арганізацый БССР.

Некаторыя дэлегаты пленуму не згадзіліся з вывадамі абсьледваньня работы ЦСПСБ, паказваючы, што ў іх занадта згушчаны фарбы па недахватах і зусім не высьветлены дасягненьні ў рабоце прафсаюзаў БССР.

Тав. **Плаўнік** (ЦП саюзу гарбароў) адзначыў, што ў вывадах зусім не гаворыцца аб росьце прафактыву. Між тым, за апошнія гады мы маем значны рост прафэсыянальнага актыву, як у ЦП і акрадпрадзяленьнях, так і ў ФЗК—на прадпрыемствах.

Тав. **Ізох** (Менск) падтрымлівае думку т. Плаўніка і прыводзіць рад фактаў, якія гавораць аб дасягненьнях у рабоце прафсаюзаў. Так, напрыклад, узьнялася актыўнасьць у рабоце розных гурткоў на прадпрыемствах, узрасла самадзейнасьць гурткоў пры клюбах і г. д.

Асноўнае, што нам трэба высьветліць,—кажа т. **Раксін** (старшыня саюзу харчавікоў)—ці ёсьць пералом у бок паляпшэньня работы прафсаюзаў.

У вывадах сказана, што яго няма.

Мы-ж канстатуем, што гэты пералом ёсьць. Прафсаюзы мабілізавалі ўвагу рабочых мас вакол асноўных задач пашага будаўніцтва.

Масы прынялі самы шырокі ўдзел у справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў, падзвычайна вялікі ўдзел у пасеўнай кампаніі.

— Мы ні ў якім разе не гаворым, што наша работа пастаўлена, як належыць, але было-б памылкай замазваць і зусім ня бачыць дасягненьняў. Трэба дадаць яшчэ, што нашы прафсаюзы ўладаюць вельмі нешкалікімі сродкамі, якія патрэбны для культмасавай работы.

Тав. **Фрусін** (Магілеў) гаворыць, што самакрытыка ў рабоце прафсаюзаў разгорнута слаба. Культработа ў большасьці клюбаў зводзіцца да кіно і спэктакляў, новых мэтадаў і форм культработы яшчэ няма.

Літаратура аб правым ухіле

І. В. Быстрянский. «К характеристике правого уклона», «Прибой», 1929 г., стр. 90, цена 20 коп., серия «За ленинскую линию партии».

Далёка ня кожны камуністы зразумеў тую ісьціну, што правы ўхіл зьяўляецца галоўнай небясьпекай у партыі на даным этапе. Для таго, каб гэта зразумець і ўсьвядоміць, мала адчаго асуджэньня: трэба добра ўявіць сацыяльныя карэньні і прычыны правага ўхілу. Толькі тады можа ісьці гутарка аб пасьпяховым змаганьні з ім. Інакш, барацьба няўхільна выліваецца ў адно «алялуйства».

Брашура тав. **Быстранскага**, як нельга лепш, дапамагае выкрываньню сапраўднага твару правага ўхілу. Вялікай паслугай брашуры зьяўляецца тое, што характарыстыка правага ўхілу, якая даецца ў ёй, зроблена на падставе **ўласных выказваньняў тав. Леніна** аб антыпартыйных ухілах. Аўтар добраасумленна падабраў і падаў у даступнай для радавога партыйца форме **асноўныя выказваньні і характарыстыкі Леніна** аб ухілах у розных пэрыядах барацьбы бальшавіцкае партыі.

У першым разьдзеле кнігі **«Социальные корни правого уклона»** чытач знойдзе ясны адказ на тое, адкуль бяруць пачатак розныя ўхілы ў партыі. **«Мелкобуржуазные шатания», — учил нас Ленин,—неизбежны, пока не устранены самые глубокие корни капитализма» (ст. 7).** Выходзячы з гэтай установкі брашура высьвятляе, што сучасны правы ўхіл — ёсьць нішто іншае, як праяўленьне тых-жа дробна-буржуазных хістаньняў, захапіўшых сабой пеявялікую частку партыі.

У залежнасьці ад абставін, гэтыя хістаньні выліваюцца або ў «дробна-буржуазны рэвалюцыянэрызм» або «дробна-буржуазны рэфармізм».

Да першага роду трэба аднесьці троцкізм, які і пачаў, як вядома, з «левай фразы», а скончыў адкрытай антысавецкай работай; да другога роду можна аднесьці правы ўхіл, які аб'ектыўна скочваецца на рэфармісцкі, меншавіцкі шлях.

Што-ж ляжыць у аснове псыхалёгіі правых? «Настроі найглыбейшага пэсымізму, пачуцьцё поўнае роспачы» перад сёньняшнімі труднасьцямі — вось гэтая «аснова», выказаная Леніным у 1918 г. з поваду пазыцый «левых камуністых».

Але роспач і паніка ёсьць лёс адзінак, а ня мас, таму партыя ня можа дазволіць заражаць дробна-буржуазнай бесхарактарнасьцю свае рады. Тым больш, што выказаныя Троцкім у свой час «спалоханыя прадраканьні» так і засталіся на яго містэрскім сумленьні.

У наступным (II-м) разьдзеле чытач знойдзе для сябе ясны адказ, у чым «гвоздь» адыходу правых ад палітычнай лініі партыі. Не сакрэт, што некаторыя з пранырлівых абываталяў з партбілетам або прымірэнцы схільны тлумачыць гэты адыход, як вынік «сваркі» паміж правадырамі, не жадаючы глыбей пазглядзець на справу. Тыя-ж, хто захоча ідзе аб карэнных пытаньнях дыктатуры пралетарыяту. Такім пытаньнем зьяўляецца **саюз рабочае клясы з сялянствам, які правыя (высьвятлена ў**

тлумачаць вельмі своеасабліва і апартуністычна. Паводле Леніна галоўная мэта саюзу ёсьць **узмацненьне пралетарыяту** як кіруючай клясы. Гэтым **уже** даецца і мяжа магчымых уступак сялянству. Заклікаючы да «пэрманэнтных уступак» серадняку, правыя начыста адхіляюць

Пэрспэктывы хэмізацыі беларускай прамысловасьці

Асноўная ўвага хэмічнай апрацоўцы лесу, торфу і фасфарытам

Патрэбнасьць БССР у мінэральных угнойваючых туках і інсэкта-фунгісідах зараз пакрываецца выключна прывозам з іншых раёнаў СССР і часткова імпартам. Пэрспэктыўным планам прамысловасьці намячаецца пабудаваць супэрфасфатны завод (або прыцыпытатны), два фасфарытныя і касьнямольны. Акрамя таго, будзе адноўлены невялікі касьцямольны завод Магілеўскага акрыканкому. Супэрфасфатны завод магутнасьцю ў 40 тыс. тон дасьць сваю прадукцыю толькі ў наступным пяцігодзьдзі. Фасфарытная мука прамысловасьць БССР забясьпечана будзе да канца пяцігодзьдзя толькі на 11,6 проц. Касьцяной мукі будзе выраблена ўсяго 7,8 тыс. тон.

Даныя геалёгічных досьледаў БССР як па лініі геалёгічнага камітэту Беларускай Акадэміі Навук, так і горнага аддзелу ВСНГБ, а таксама пэлярад геалёгічных работ у даваенны час гавораць за тое, што раёны Беларусі багатыя вапнавымі адкладамі, і плян вапнаваньня будзе забясьпечаны ўнутранай вытворчасьцю, якая мае сырочную базу, што ў шмат раз перавышае патрэбнасьць.

З інсэкта-фунгісідаў на выраб у межах БССР можа разьлічваць толькі жалезны купарвас, які будзе вырабляцца з адкідаў гвазьдзільнага заводу Мэталятрэсту. Серкава-вугляцлёны завод, што намячаецца пабудаваць, дасьць прадукцыю толькі ў 1931-32 годзе.

Стык хэмічнай прамысловасьці ў сельскай гаспадарцы ажыцьцяўляецца далей па лініі хэмічнай пераапрацоўкі с.-г. сырцу. Пераапрацоўка бульбы з атрыманьнем прадуктаў крухмалу (дэкстрын, патака, глюкоза), далейшае разьвіцьцё хэміка-бушавальных прадпрыемстваў, да якіх трэба аднесьці і фэрмэнтацыйнае атрыманьне ацэтону, пераапрацоўка абрату на казэін і атрыманьне з яго галёліту, пераапрацоўка алкідаў вытворчасьцяй, што пераапрацоўваюць сырэц жывёлы (клей і жэлятына), а таксама і косьці у апошнім выпадку—з атрыманьнем угнойваючага туку (касьцяной мукі),—вось кароткі пералік вытворчасьці, намечаный пэрспэктыўным планам, вытворчасьці, якая зьвязвае прамысловасьць з сельскай гаспадаркай.

РАЗЬВІЦЬЦЁ ПАДСОЧНАЙ ГАСПАДАРКІ

Агульная плошча лясоў дзяржаўнага значэньня раўняецца 2.682 тыс. гэкт., у тым ліку 1.260 тыс. гэкт прыпадае на хвойныя насажэньні. Гадавая лесасека навіна дайсьці прыкладна да 29 тыс. гэкт., з якіх 14-15 тыс. гэктараў прыпадае на хвойныя пароды, а з іх 9-10 тысяч гэкт. дае сасна. Разьвіцьцё падсочнае гаспадаркі пры гэтых прадпасылках зьяўляецца зусім натуральным вырашэньнем праблемы павышэньня прыбытковасьці і навяжэньня экспартных рэсурсаў краіны.

Лясы БССР знаходзяцца ля вадавозу сплаўных рэк і вельмі даступны для чыгуначнага транспарту. Лёгкасьць эксплёатацыі стварае тут вельмі высокую цэнасьць лесу, як крыніцы будаўнічага і паддзелачнага матар'ялу, і гэтым вызначаецца характар вядзеньня падсочкі. Пэрспэктыўным пяцігадовым планам намячаецца зрабіць падсочку на 25 тыс. гэкт. лясной плошчы, прычым падсочка будзе весьціся нямецка-амэрыканскім спосабам, г. зн. падсякаюць дрэва за 4-5 год да яго рубкі, не парушаюць яго будаўнічых якасьцяй. Запраставаны разьмер падсочнае гаспадаркі, да якога яна будзе даведзена ўжо на трэцім годзе пацігодкі, абхапляе амаль усю годную для падсочкі плошчу. Пры разьліку атрыманьня жывіцы ў 0,25 тон з гэктару, з выхадам 72 проц. каніфолі і 18 проц. шкіпінару, атрымаецца прадукцыя ў разьмеры каля 5,5 тыс. тон каніфолі і 800 тон шкіпінару кожны год.

Эксплёатацыя пнёвае гаспадаркі БССР паводле пяцігадовага пляну намячаецца як на лініі далейшага разьвіцьця смалакурэньня, так і шляхам пабудовы экстрактнага каніфольна-шкіпінарнага заводу.

Пры агульным росьце прадукцыі смалакурнае вытворчасьці на 81 проц. за пяцігодзьдзе, дзяржаўнае смалакурэньне павялічваецца ў 6,8 раз, каапэрацыйныя арцелі даюць рост прадукцыі ў 2,6 раз, саматужныя таварыствы паказваюць скарачэньне прадукцыі на 4/5 і прыватнае смалакурэньне памяншаецца ў 6 раз.

Экстрактны каніфольна-шкіпінарны завод намечана пабудаваць у 1930-31 годзе ў Рэчыцкай акрузе. Яго прадукцыйнасьць будзе складаць 1.300 тон каніфолі і 300 тон шкіпінару.

ВЫЗВАЛІЦЦА АД ЗАМЕЖНАЙ ЗАЛЕЖНАСЬЦІ

Другім відам экстрактна леса-хэмічнае прамысловасьці зьявіцца экстрактна-дубільны завод, які пачне будавацца ў гэтым годзе. Гэты завод вызваліць БССР ад імпарту дубіцеляў і амаль поўнасьцю забясьпечыць скураную прамысловасьць як Беларусі, так у значнай меры і прылягаючых раёнаў. Нарэшце, да лесэ-хэмічнай прамысловасьці яшчэ аднесены і намечаны да пабудовы ў 1929-30 г. цэлюлёзны завод у Бабруйску магутнасьцю ў 17 тыс. тон драўнінай цэлюлёзы, які разам з пашыранай устаноўкай на выпрацоўцы саламянай цэлюлёзы на Добрускай фабрыцы паперы забясьпечыць патрэбнасьць паляровай прамысловасьці БССР. Сырцовая база для гэтага заводу ёсьць у яловых і часткова асінавых насаджэньнях басэйну Бярэзіны, які без асаблівае цяжкасьці дасьць патрэбныя 100 тыс. куб. мэтраў папіргольца.

ВЯЛІЗАРНЫЯ МАГЧЫМАСЬЦІ Ў ГАЛІНЕ АПРАЦОЎКІ ТОРФУ

Другім відам надзвычайна важнага сырцовага рэсурсу ва ўмовах БССР зьяўляецца торф. Паводле арыентовачных даных плошча тарфяных балот БССР вылічана каля 465 тыс. гэкт. з запасам паветрана-сухога торфу да 1,2 мільярд. тон. Такая вялікая колькасьць торфу, пры амаль універсальных магчымасьцях яго скарыстаньня—для энэргетычных мэт, у сельскай гаспадарцы і для прамысловай пераапрацоўкі, высоўвае торф на першае месца ў эканоміцы краіны. Паводле пяцігадовага пляну вялавая прадукцыя тарфяной прамысловасьці павялічваецца ў 7,5 раз. Акрамя таго будуецца рад новых заводаў па ўсебаковай апрацоўцы торфу, якія дадуць сваю прадукцыю ў першыя гады наступнага пяцігодзьдзя. Хэмічная пераапрацоўка торфу знаходзіць сваё адлюстраваньне ў пяцігодцы пабудовай заводаў—тарфяных фарбаў у 1930-31 годзе, сьпіртысовага—у 1931-32 г. і коксавага—у 1932-33 г. У сельскай гаспадарцы хэмічныя ўласьцівасьці торфу намечана скарыстаць для ўгнойваючых мэт як непасрэдна, так і праз подсьцілі.

ЗАЛЕЖЫ ФАСФАРЫТНЫХ РУД

Сырцовая база фасфарытнай прамысловасьці БССР забясьпечваецца залежамі фасфарытаў у басэйне ракі Сожу як у Крычаўскім і Мсьціслаўскім раёнах, так і ў прылягаючых да БССР раёнах Смаленскай губэрні. Ва ўжо вызначаных і дэтальна дасьледаваных вучастках для будаўніцтва фасфарытных заводаў, запас фасфарытнай руды вызначаецца ў разьмеры каля 1 міл. тон, а разам з плошчамі, атрыманымі пад прамысловую разьведку і часткова дасьледаваных, гэты запас даходзіць да 9-10 міл. тон. Фасфарытны завод у Крычаве будуецца ў 1928-29 г., другі завод у Мсьціслаўі—у 1930-31 г. і супэрфасфатны (або прэцыпытатны) у 1931-32 годзе. У зьвязку з пабудовай апонняга заводу ўжо прыступлена да работ па адшуканьні мэтадаў абагачэньня сосхіх фасфарытаў.

З другіх галін хэмічнае прамысловасьці трэба адзначыць вытворчасьць штучнага валакна. Фабрыка штучнага шоўку пачнае будавацца ў Магілеве ў 1928-29 г. з прадукцыйнасьцю ў 800 тон прадуктаў у год. У 1931-32 г. фабрыка гэта пашырасьцца да падвойнага разьмеру. Арыентовачна падлічаная патрэбнасьць у штучным валакне тэкстыльнай і панчошна-трыкатажнай прамысловасьці БССР вызначаецца ў апошнія гады пяцігодзьдзя ня менш, чым у 2-2,5 тыс. тон валакна.

У зьвязку з пабудовай пералічаных заводаў удзельная вага хэмічнай прамысловасьці з 0,8 проц. у 1927-28 г. узрастае да 5,2 проц. у 1932-33 годзе. Пры павялічэньні прадукцыі ўсёй цэнавай прамысловасьці ў 4,2 разы хэмічная прамысловасьць павялічвае сваю прадукцыю ў 27 раз.

Паскорыць пабудову хэмічных заводаў

На пленуме камітэту хэмізацыі народнай гаспадаркі

Гэтымі днямі адбыўся пленум камітэту хэмізацыі народнай гаспадаркі БССР. У пленуме прымала ўдзел каля 50 чалавек. Былі разгледжаны два пытаньні: пытаньні хэмізацыі ў 5-цігадовым пэрспэктыўным пляне народнай гаспадаркі БССР (даклад інжынэра В. С. Натансона) і культура цукровых буракоў і пэрспэктывы арганізацыі прамысловага цукраварэньня ў БССР (даклад праф. А. В. Ключарова).

Азнаёміўшыся з першым пытаньнем, пленум прызнаў, што пяцігадовы плян хэмізацыі ў асноўным складзен у адпаведнасьці з становішчам сучаснай навукова-тэхнічнай думкі і адбівае дырэктыву ўраду аб разьвіцьці народнае гаспадаркі. 5-цігадовы плян хэмізацыі гаспадаркі БССР правільна вырашае задачу ўзьняцьця ўраджайнасьці глебы і індустрыялізацыі краіны. Ажыцьцяўленьне гэтага пляну адкрывае шырокія пэрспэктывы для далейшага разьвіцьця хэмічнай прамысловасьці БССР.

Пленум лічыць, што пабудову новых хэмічных прадпрыемстваў трэба паскорыць, асабліва, пабудову заводаў па распрацоўцы фасфарытаў. Да канца пяцігодкі трэба здабыць 150.000 тон фасфарытаў, замест 36.000 тон, намечаных плянам. Трэба таксама прапрацаваць пытаньне аб арганізацыі ў БССР вытворчасьці азотных угнаеньняў, скарыстаўшы торф і калійных угнаеньняў, скарыстаўшы глаўканітныя пяскі.

Пленум адначаў таксама і па слабое месца пляну—пытаньне аб кадрах—і выказаўся за больш шпаркае разьвіцьцё і ўзмацненьне навукова-дасьледчай работы ў галіне хэміі.

Нарэшце, пастаноўлена зьвярнуць увагу адпаведных устаноў на необходнасьць разьвіцьця ў БССР хэмічна-фармацэўтычнай прамысловасьці.

Значную ўвагу пленум зьвярнуў на пытаньне арганізацыі ў БССР прамысловага цукраварэньня і канстатаваў, што разьвіваньне цукровых буракоў у Беларусі мае вялікае гаспадарчае значэньне. Пленум адзначыў добрыя вынікі першых досьледаў па разьвіваньні цукровых буракоў і пастанавіў пашырыць гэтыя досьледы, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на Хойніцкі і Слуцкі раёны.

Пастаноўлена даручыць ВСНГБ вывучыць праз Інстытут Прамысловасьці, што зараз арганізуецца, эканамічную рэнтабэльнасьць арганізацыі цукровай прамысловасьці і выявіць найбольш рэнтабэльныя раёны для разьвіваньня культуры цукровых буракоў.

Злачынная нядбайнасьць гомельскай пракуратуры

Справа аб бандытах 22 месяцы ляжала ў стале нам. акрпракурора

З 1921 па 1926 г. у раёнах Брагіна і Лоева, былое Рэчыцкае акругі, адправаці рэшткі банды Галака пад кіраўніцтвам Патапенка. Сваімі ўчынкамі бандыты выводзілі жах на ўсё вакольнае насельніцтва. Сяляне паказаных раёнаў добра памятаюць гэтыя дні, калі разгульвала банда. Памятае асабліва гэты час яўрэйскае насельніцтва, з якім банда асабліва жорстка абыходзілася. Пры налётах банда катавала і забівала жыхароў. Бандай была забіта сям'я Каплана Янкеля ў вёсцы Пятруцкае. Банда абрабавала таксама ў Брагінскім раёне спажывецкае таварыства. За 5 год банда зрабіла дзесяткі ўзброеных нападаў і грабежніцтваў.

Улетку 1926 г. дзесяць бандытаў і супольнікаў былі выкрыты і арыштаваны.

У жніўні 1927 г. пам. пракурора па Брагінскім раёне Бабчонак перадаў гэтую справу гомельскаму акруговаму пракурору для накіраваньня справы ў акруговы суд. **З таго часу справа, як у ваду канула.** Сяляне Брагінскага і Лоеўскага раёнаў дзівіліся: што здарылася са справай? **Чаму выпусьцілі бандытаў?** Чаму ім дазволілі хадзіць па вёсках і зноў наганяць жах на сялян?

Толькі цяпер усё стала ясным. **З чэрвеня 1929 г. крымінальная справа № 160 па абвінавачаньні Патапенка і інш. грабежнікаў па арт. 80 крымінальнага кодэксу (старой рэдакцыі) знайшлася ў нам. акруговага пракурора ў стале.** Справа там праляжала **22 месяцы** і цяпер ціха перадана сьледчаму для сканчэньня сьледзтва. **А сьледзтва было ўжо скончана.**

Трэба праверыць пракурорскія шуфляды, работу пракуратуры і ўлічыць усё ў часе чысткі апарату.

«КАВАЛЕРЫЯ».

Сацыялістычнае спаборніцтва на вёсцы

Саўгасу Пагост трэба падцягнуцца

Аднабаковая самакрытыка або кій з двума канцамі.—„Жарты", якія дорага каштуюць дзяржаве.—Рвачы, якія не адрозьніваюць сваёй маемасьці ад саўгаснае.—Працдысцыпліна кульгае на абедзьве нагі

Саўгас Пагост — адзін з буйнейшых саўгасаў ня толькі Бабруйшчыны, але і ўсёй БССР. Але Пагост да гэтага часу чамусьці маўчыць, быццам-бы яго і не датычыць магутная хваля сацыялістычнага спаборніцтва, якая ўжо ахапіла ўвесь наш саюз. Ужо многія саўгасы Беларусі шляхам выклікаў і прыняцьця ўмоў таксама далучыліся да спаборніцтва. Пачынаюць варушыцца і вёскі.

І дзіўна нават робіцца: чаго чакае гэты вялікі з розным відамі прамысловасьці саўгас?

Бязумоўна, што гэта толькі маленькая недарэчнасьць, бязумоўна, што саўгас сёньня-заўтра ўступіць у спаборніцтва, і таму мы лічым ня лішнім адзначыць тыя балячкі, якія яшчэ шкодзяць саўгасу Пагост выйсьці на першую лінію барацьбы за сацыялістычную рэканструкцыю сельскае гаспадаркі.

Тыя недахопы, якія з «былымі» людзьмі, з няправільным кіраўніцтвам, якое было да гэтага часу ў саўгасе, выклікалі вялікую хвалю рабочае самакрытыкі на ўсе недахваты ў працы саўгасу. Ажывіліся рабочыя сходы, пачала выдаваць насьценная газэта, амаль кожны рабочы пачаў выпісваць газэту, адміністрацыя пачала больш уважліва прыглядацца да жыцьця і запатрабаваньняў рабочых.

Але і тут справа не абыйшлася без «перагібу палкі». Тая здаровая хваля самакрытыкі, якая паднялася, зараз-жа была накіравана толькі ў адзін бок, у бок крытыкі работы адміністрацыі, нагляду за кожным няправільным крокам яе.

Рабочыя ўпусьцілі другі важнейшы бок самакрытыкі — гэта самакрытыку саміх сябе, крытыку недахопаў, крытыку іх працоўнай дысцыпліны.

Многія рабочыя і нават партыйцы крытыку зразумелі так, што «крытыкаваць можна толькі адміністрацыю». А, між тым, недахопаў у галіне працоўнай дысцыпліны ў саўгасе шмат. Падам некаторыя з іх. Ня так даўно ў саўгасе працавала паравая малатарня. Рухаў не лёкамабіль праз перадатачны вас. Аднаму з штатных работнікаў прыйшло ў галаву «пажартаваць» з пасам, і, пад адабраючыя словы другіх рабочых, ён узяў вады і выліў яе на нас, калі машына ішла поўным ходам. Пас зразу-ж зьляцеў. Паравік залязкаў з вышэйшай хуткасьцю на халастым ходу, і, каб ня спрытнасьць спрактыкаванага рабочага качагара (які, рызыкуючы жыцьцём, падбег і выпусьціў пару), дарагі лёкамабіль разьляцеўся-б на кавалкі. Не абыйшлося-б і без ахвяр з боку рабочых. А, між іншым, усё гэта былі «жарты».

А вось другі факт. Рабочы Пратасеня залажыўся з другім рабочым — хто больш накладзе на воз бульбы. Пратасеня наклаў такі воз, што конь вырваўся з аглабель і тут-жа здох. І гэта таксама палічана за «жарты».

А вось факты — ужо зусім абураючыя.

З саўгасу выехаў жывёлавод. На яго месца часова вылучылі рабочага Ложачніка. Пачаў працаваць. Праз некалькі тыдняў заўважылі, што пялятыі пачалі худзець і худзець. Прыцлося некаторых дарэзаць. Пачалі шукаць прычын і высьвятлілі, што Ложачнік тым аўсом, які трэба было даваць цялятам, карміў чэцьвера сваіх сьвіней.

Паставілі пытаньне на сходзе рабочых. І што-ж вы думаеце? Знайшліся некаторыя рабочыя, якія выказаліся за злодзея! Замест Ложачніка паставілі другога рабочага Януша Трахіма, а і ён карміў саўгаскім аўсом сваіх сьвіней.

Вось вам і прадцысцыпліна, вось і зацікаўленасьць да гаспадаркі, як да сваёй.

Вось факты. Яны ясныя бяз лішніх камэнтараў. Выводаў я таксама не раблю, лічу, што і яны ясныя. Адзін вывад: партыйная арганізацыі саўгасу Пагост трэба зараз-жа паставіць пытаньне аб павялічэньні прадукцыйнасьці і аб працоўнай дысцыпліне ў саўгасе Пагост, Бабруйскае акругі.

Ю. БЯЛЬКО.

ПЛЕМГАСПАДАРКА ІМЯ КАЛІНІНА ВЫКЛІКАЕ РУСІНАВІЧЫ

Мы, рабочыя і служачыя племгаспадаркі імя Калініна (Менскае акругі), выклікаючы на сацыялістычнае спаборніцтва племгаспадарку, адзначаем вынікі нашай работы па ўзмацненьні ўсіх галін гаспадаркі.

За апошнія 3 гады наша гаспадарка дабілася даволі значных посьпехаў. Склад племяннай жывёлы чырвона-беларускай пароды павялічыўся з 48 кароў у 1926 годзе да 89 кароў у гэтым годзе. Зараз ёсьць 5 бугаёў, з якіх 2 прызначаны для сялянскіх кароў. Стада павялічылася за кошт выгадаванага маладняка, дзякуючы чаму склад стада яксна палепшыўся. Сярэдні гадавы ўдой каровы—130 пуд малака.

Гаспадаркай выпушчана 69 бугаёў на злучныя пункты раёну, якія значна адбіліся на паляпшэньні сялянскіх стад. Зараз у сялян Самахваланіцкага раёну налічваецца значная колькасьць чырвонага быдла і пазіраецца вялікая зацікаўленасьць да галоўлі чырвона-беларускае пароды быдла. Зараз да вясны і восені г. г. гаспадаркай задуецца 16 бугаёў для сялянскіх пунктаў. У гэтым годзе цялята хварэлі на розныя хваробы, ад чаго частка цялят загінула. Упартай барацьбой хваробы ліквідаваны і зараз цялята маюць добры выгляд.

Абора добра абсталявана, паложаны цэмэнтавыя падлогі. Па аборы паложаны рэйкі, па якіх ходзяць ваганэткі, развозяць корм і вывозяць гной. Пабудаваны новы гліна-хварасьцяны цялятнік па сто галоў. Пабудавана цэмэнтная паказальная хавальня для гною. Для забесьпячэньня бунькоўнага і напарнага палеткаў гноем, уносіцца торф на подсьціл і ўгнаеньне, які за час ужываньня за апошнія два гады даў вельмі добрыя вынікі на павышэньні ўраджаю.

Сеем ужо 3 гады выключна радковымі сявяркамі. З восені мінулага году ўсе палеткі пад яравыя і напар былі ўзораны пад зяб. Ні адна лапіна зямлі не застаецца нескарыстанай.

За апошнія гады гаспадарка дасягнула ўраджаю: ішаніцы азімай 110 пуд. з дзесяціны, жыта—100 пуд., аўсу—110 пуд., ячменю—78 пуд., бульбы—1 000 пуд., кораньплодаў—1.200 пуд з дзесяціны.

За асобныя заслугі на працоўным фронце ЦВК Бел. узнагарадзіў у дзень агаламаньня дзесяцігодзьдзя БССР племгас імя Калініна ордэнам працоўнага сьцягу.

Мы, рабочыя і служачыя племгасу імя Калініна, бярём на сябе правесьці ў працягу гэтага году наступныя задачы:

1. Забясьпечыць быдла кармамі, для чаго свачасова ўбраць сенажаць, канюшыну і кораньплоды. Залажыць 6.000 пуд. сілосаў і заготовіць належную колькасьць моцных кармоў.
2. Выгадаваць добры маладняк рагатай жывёлы.
3. Падрыхтаваць і правесьці асеньнюю пасеўную кампанію да 1-га верасьня.
4. Цалкам заняць напар гноем, для чаго падрыхтаваць належную колькасьць тарфянога подсьцілу і залажыць кампосныя тарфяныя кучы.
5. Павысіць працоўную дысцыпліну і зьнішчыць прагулы.

Адзначыўшы гэтыя дасягненьні і ўскладзены на сябе яшчэ новыя задачы (9 пунктаў), выклікаем на спаборніцтва племгаспадарку Русінавічы.

Уперад за ўзбуйненьне і паляпшэньне сельскай гаспадаркі.

НЯМА ЗРУХУ Ў РАБОЦЕ

па мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў прамысловасьці

Трэсты абмежаваліся агульнымі дырэктывамі і не ўстанавілі ніякага кантролю за іх выкананьнем прадпрыемствамі.—Запасы сырцу і матар'ялаў на прадпрыемствах не скараціліся і перавышаюць вызначаныя нормы.—ВСНГБ катэгарычна патрабаваў ад кіра нікой трэстаў і дырэктароў прадпрыемстваў—дабіцца ад іх асабістую адказнасьць рашучага зруху ў мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў і скончыць гэту работу ў трэцюю квадру.

Неабходнае растлумачэньне

Адказ на артыкул Л. Нікфедава

«Мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў прамысловасьці на мёртвым пункце» («Зьвязда» № 118 1929 г.).

Мабілізацыя рэсурсаў мае сваёй мэтай паскорыць капіталазварот прамысловасьці і гэтым самым забясьпечыць выкананьне фінансавага пляну, складзенага са значнай напружанасьцю. У гэтым напрамку пры разгляде прамфінпляну асобных гаспадарчых адзінак былі ўстаноўлены ВСНГ адпаведныя нормы лімітаў зваротных сродкаў як на лініі матар'яльных каштоўнасьцяй, так і па лініі фінансавай.

Кампанія па мабілізацыі рэсурсаў, што праводзіцца ў гэты час, мае асабліва важнае значэньне, высоўваючы на першы плян пытаньні, зьвязаныя з выкананьнем паказаных дырэктыў. Асноўныя лініі, па якіх павінна праходзіць работа па мабілізацыі рэсурсаў, даны былі прэзыдыумам ВСНГБ трэстам і гаспадарчым адзінкам у канцы сьнежня 1928 г.

Невыстарчальнасьць праведзенай трэстамі работы ў галіне мабілізацыі рэсурсаў і рад дапушчаных дэфектаў былі адзначаны прэзыдыумам ВСНГБ 23-га лютага г. г. Адначасова была зьвернута ўвага трэстаў на необходнасьць фарсаваньня нармалізацыі запасаў матар'яльнай каштоўнасьці, пяскончанай вытворчасьці і ліквідацыі лішкаў матар'ялаў і непатрэбнай маемасьці.

У далейшым ВСНГБ была вызначана асобная камісія, якая ўтварыла праверку найбольш буйных трэстаў і пераглядзела ліміты матар'яльных каштоўнасьцяй у бок значнага іх скарачэньня (дадатковае скарачэньне запасаў вызначаецца, прыкладна, у 500.000 руб.).

Прыведзенае паказае, што ВСНГ быў прыняты цэлы рад мерапрыемстваў да правядзеньня кампаніі па мабілізацыі рэсурсаў.

Што датычыць паказаньня аўтара артыкулу на тое, што ВСНГ устанавіў для дэфіцытных тавараў павышаныя нормы, дык тут трэба адзначыць наступнае. Пры вызначэньні зваротных сродкаў для асобных трэстаў, ВСНГБ абмежаваўся толькі ўстанаўленьнем лімітаў асноўных разьдзелаў матар'яльнага балянсу, як: сырцу, аналу і інш. дапаможных матар'ялаў. Нармалізацыя запасаў на асобных матар'ялах з прычыны таго, што гэтая задача парознаму вырашаецца на розных вытворчасьцях, павінна быць праведзена кожным прадпрыемствам паасобку. У даным выпадку, у зьвязку з умовамі забесьпячэньня вытворчасьці і знаходжаньня прадпрыемства, можа часам выяўляцца необходнасьць больш высокай забясьпечанасьці данага прадпрыемства дэфіцытнымі матар'ямі. Зразумела, аднак, што пры гэтым утварэньне надзвычайных, страхавых запасаў ня можа быць дапушчана.

У адносінах Палесдруку трэба сказаць, што ўсе распараджэньні ВСНГБ, якія былі да 1/II г. г., г. зн. да моманту далучэньня прадпрыемства да Белпапэртрэсту, былі неапрэдна перададзены ВСНГБ заводакіраўніцтву Палесдруку, а ў далейшым гэта павінен быў рабіць Белпапэртрэст. Аднак, неатрыманьне асобных распараджэньняў ад трэсту, паколькі асноўныя дырэктывы былі даны ВСНГБ, не магло служыць прычынай таго, каб заводакіраўніцтва ня было ў курсе гэтага пытаньня. Тым больш, што органам прамысловасьці «Торгово-Промышленная Газета» ўвесь час праводзіцца кампанія па ўзмацненьні работы ў гэтай галіне. Таму заява адказнага кіраўніка прадпрыемства, якая прыводзіцца ў артыкуле, зьяўляецца абсалютна недапушчальнай.

Нерацыянальнае асяданьне сродкаў і нездавальняючая работа па мабілізацыі рэсурсаў на прадпрыемствах Мэталятрэсту былі канстатаваны прэзыдыумам ВСНГБ на насяджэньні ад 4 чэрвеня г. г. Трэсту, як і іншым прадпрыемствам, ВСНГБ прапанавана прыняць рашучыя меры да правядзеньня кампаніі па мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў і ў асноўным скончыць гэту работу на працягу трэцяй квадры.

Адначасова прапанавана трэстам і функцыянальным групам ВСНГБ праверыць работу ў некаторых прадпрыемствах на месцах.

Старшыня ВСНГ БССР **КАРП.**
Зводна-плянавая група **ЛУР'Е.**

Трэсты і прадпрыемствы ня выконваюць дырэктыў

Прэзыдыум ВСНГ, абмеркаваўшы матар'ялы аб ходзе мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў прамысловасьці, адзначыў, што трэстамі дагэтуль ня выкананы даныя дырэктывы.

Ня гледзячы на рад паказаньняў прэзыдыуму ВСНГ БССР і спэцыяльнай камісіі, вызначанай для абсьледваньня работы па мабілізацыі рэсурсаў, трэсты ў большасьці выпадкаў абмяжоўваюцца толькі дачай агульных дырэктыў і разьвёрстак лімітаў (гранічных норм) зваротных сродкаў на асобных прадпрыемствах. Пры гэтым ня было праведзена канкрэтных мерапрыемстваў для ажыцьцяўленьня кантролю над прадпрыемствамі ўстаноўленых норм.

У выніку гэтага астачы матар'яльных каштоўнасьцяй на прадпрыемствах, асабліва дапаможных матар'ялаў, ня былі скарочаны і паказваюць значны разрыў з плянам у бок перавышэньня дазволеных норм.

Такі ўзрост дапаможных і розных матар'ялаў адзначаецца ў Паняровым трэсьце і Шклатрэсьце. Значныя запасы рамонтных і розных матар'ялаў выкрыты на прадпрыемствах Тэкстыльтрэсту, якім ня было ўжыта ніякіх мер да выяўленьня і ліквідацыі тых лішкаў, якія там накапіліся.

Лесбелам зусім нічога ня зроблена ў справе мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў.

Прэзыдыум ВСНГ адзначыў, што Мэталятрэстам ня былі ўжыты канкрэтныя мерапрыемствы па правядзеньні дырэктывы аб мабілізацыі рэсурсаў. Гэта акалічнасьць выклікала нерацыянальнае асяданьне сродкаў на прадпрыемствах і надзвычайную фінансавую напружанасьць.

Ня гледзячы на катэгарычныя дырэктывы ВСНГ, Мэталятрэстам да гэтага часу ня была вызначана колькасьць дапаможных матар'ялаў і лішкаў, якія ёсьць на прадпрыемствах. Абсьледваньне-ж выкрыла на прадпрыемствах Мэталятрэсту наяўнасьць надзвычайна павышаных запасаў.

Таксама па гэтых прадпрыемствах мы маем значнае перавышэньне нормы няскончанай вытворчасьці і паўфабрыкатаў. У той-жа час трэст, пры наяўнасьці такога нядобрага становішча з няскончанай вытворчасьцю, да гэтага часу не распрацаваў пляну рацыяналізацыі пераходзячых астач на асобных цэхах і вытворчасьцях.

Затрыманьне з вызначэньнем і здачай нялікіднай і непатрэбнай маемасьці прадпрыемстваў тлумачыцца, з аднаго боку, невыстарчальна інтэнсыўнай работай Рудмэталягандлю і, з другога боку, несваячасовай падрыхтоўкай гэтых сьпісаў самімі трэстамі.

Прэзыдыум ВСНБ даў трэстам і гаспадарчым адзінкам катэгарычнае даручэньне пад асабістую адказнасьць кіраўнікоў трэстаў і дырэктараў заводаў —дабіцца рашучага зруху ў ходзе кампаніі па мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў прамысловасьці і ў асноўным скончыць гэту работу на працягу 3-яй квадры. У мэтах узмацненьня работы па мабілізацыі рэсурсаў прэзыдыум ВСНГБ распрацаваў і аддаў па трэстах рад загадаў, якія павінны быць выкананы ў 2-хтыднёвы тэрмін.

Даручана трэстам на працягу чэрвеня месяца зрабіць на прадпрыемствах фактычную праверку становішча з ходам гэтай кампаніі. Акрамя таго, сіламі апарату ВСНГ да 15-га ліпеня будзе праведзена абсьледваньне аднаго з прадпрыемстваў у кожным трэсьце—як там праведзена мабілізацыя рэсурсаў.

Ч.

Рабочых ад варштату—у дзяржаўныя палітэхнікумы

Арганізаваны курсы па падрыхтоўцы рабочых у тэхнікумы

Пяцігадовы плян разьвіцьця народнае гаспадаркі ўскладае на рабочую клясу вялікую задачу, для выкананьня якое патрэбна шмат сродкаў і напружанай энэргіі. Нельга выканаць пяцігадовы плян народнае гаспадаркі, без падрыхтоўкі новых кадраў чырвоных спэцыялістых з радоў рабочай клясы.

Практыка работы за апошнія гады паказала, што падрыхтоўка паступаючых у навучальныя ўстановы адыгрывае рашаючую ролю.

Партыя і савецкая ўлада паставілі перад усімі намі задачу пралетарызацыі ВНУ. На жаль, рабочая моладзь, якая паступае ў навучальныя ўстановы, ня мае належнай падрыхтоўкі. У выніку гэтага студэнты, якія ня маюць належнай падрыхтоўкі, не пасьпяваюць працоўваць курс, і значная частка пакідае вучобу па непасьпяховасьці.

Пры Менскім дзяржаўным тэхнікуме арганізаваны курсы, якія ставяць сваёй мэтай падрыхтаваць паступаючых у беларускія палітэхнікумы (менскі, віцебскі) рабочых.

На курсы прымаюцца рабочыя з прамысловых прадпрыемстваў з двухгадовым рабочым стажам, рабочыя, якія працавалі на сельска-гаспадарчых грамадзкіх і іншых работах, з трохгадовым рабочым стажам: першыя і другія павінны мець падрыхтоўку ня ніжэй сямігадовай савецкай працоўнай школы, школ сялянскай моладзі і школ павышанага тыпу.

Трэба сказаць, што мясцовыя арганізацыі мала ўвагі зьвярнулі на гэту справу, у выніку чаго на курсы паступіла мала заяў.

Між тым, лік жадаючых паступіць у навучальныя ўстановы вельмі вялікі.

З мэтай большага прыцягненьня рабочых у навучальныя ўстановы, тэрмін прыёму заяў на падрыхтоўчыя курсы працягваецца да 15 чэрвеня, заняткі пачнуцца 20 чэрвеня. Засталося мала часу, які трэба як мага хутчэй скарыстаць, каб не парушыць намечанага пляну падрыхтоўкі.

Каб даць магчымасьць рабочым вучыцца на курсах, яны атрымаюць стыпэндыю 20 руб. у месяц, інтэрнат і навучальныя прылады. Умовы прыёму разасланы па ўсіх акругах Беларусі.

ІОДЫШЫС.

Да вярбоўкі ў вайсковыя школы

Стопроцантны адбор

Фэльетон

Атрымаўшы дырэктыву аб удзеле ў кампаніі па вярбоўцы ў вайсковыя школы, старшыня заўкому «Чырвоны Пухаўчык» быў вельмі нездаволены.

— І так не адпачнеш—прагулы, сацспаборніцтвы, прадукцыйнасьць працы, адпачынкі, культработа. А тут яшчэ новая справа—вайсковыя школы. Пры чым-жа мы тут. Пішуць—«забясьпечыць максімум увагі Чырвонай арміі». Ды мы-ж 25 лютага поўнасьцю забясьпечылі: сьцяг паднесьлі, трыста рублёў на абед далі.

— А можа абвестку такую вывесіць, што, моў, да паступленьня ў вайсковыя школы з боку заўкому нерашкод няма, —запрапанаваў член заўкому.

— Пачакайце. Набор-жа ў школы пачнецца ўвосень, так што пасьнеем,— абрадаваўся старшыня, прачытаўшы цыркуляр. Вылучым, якія пад скарачэньне падыходзяць, ня гнаць-жа хлапцоў з кваліфікацыі. А цяпер пяройдзем да чарговых спраў.

— Куды-ж паперку дзець?—запытаўся сакратар пасьля пасяджэньня.

— Наконт школ—падшый пакуль што да справы, каб да восені вачэй ня муляла. У якую справу?—Ды хоць у клюбную.

— Ды там напісана, каб правесьці кампанію ў тэрміновым і ўдарным парадку.

— Дзіўны чалавек, — усьміхнуўся спрактыкаваны ў прафработе старшыня. Раз кампанія, дык абавязкова ў тэрміновым і ўдарным. Гэта так заўсёды пішацца.

— Тут, да рэчы, Пётр Жалезкін наконт школы заходзіў, вельмі цікавіцца стаць камандзірам.

— Скажы, каб заяву падаў,—на ходу кінуў старшыня.—Пачнецца кампанія, мы яго ў плянавым парадку завярбуем.

Дні ішлі. Кампанія зьмянялася кампаніяй. Абяцелі літкі з заўкомаўскага каляндару. Старшыня круціў у руках сьвежую паперку і наступаў на сакратара.

— Душа з цябе вон,—давай цыркуляр. Патрабуюць вынікаў па вярбовачнай кампаніі. А ў нас што? А ў нас—нічога. Ах, ліха матары, першую кампанію за ўсё прапукаць праваронію.

Пасьля доўгіх пошукаў цыркуляр быў знойдзены разам са сьнісам паламаных клюбных крэслаў і рахункаў «эгіпэцкага мага» тав. Бэн-Оглы, які выступаў у парадку ажыўленьня вытворчае нарады. Разам з цыркулярам была падшыта і заява Пятра Ж

За добрыя дарогі, за мэханізаваны транспарт

Як працуюць ячэйкі Аўтадору на мясцох

Пачаўся «тыдзень Аўтадору»... Пачаўся першы паход Аўтадору на фронце барацьбы з бездарожжам...

Работы шмат, адным націскам яе нельга выканаць, нават пры прыцягненьні да гэтае справы ўсёй савецкай грамадзкасьці. Дрэнныя дарогі—наш біч, спадчына мінулага—яшчэ доўгі пэрыяд будуць затрымліваць наша гаспадарчае разьвіцьцё, будуць перашкаджаць узмацненьню сувязі гораду з вёскай.

Аўтабус—адзіны магчымы сродак сувязі з найбольш адсталымі раёнамі—і цяпер, у летні пэрыяд з вялікай цяжкасьцю можа дабрацца нават да раённых цэнтраў. Ня прыходзіцца думаць аб тым, як-бы зьвязаць акруговыя цэнтры з асобнымі сельсаветамі. Нават на існуючых лініях аўтабусы з вялікай цяжкасьцю перамагаюць тыя шматлікія перашкоды, якія ёсьць на нашых «дарогах».

Ня гледзячы на сваячасова даныя дырэктывы, большасьць раённых арганізацый Менскае акругі ня ўлічылі важнасьці правядзімай кампаніі. Амаль ні ў адным раёне ня створаны былі камісіі на правядзеньні «тыдню Аўтадору». Ячэйкі Аўтадору, якія намецілі правядзеньне якіх-небудзь работ, вельмі часта не сустракаюць падтрыманьня ў мясцовых арганізацый. Некаторыя раёны, атрымаўшы дырэктывы аб правядзеньні «тыдню», палажылі іх пад сукно, і толькі прыезд прадстаўнікоў акруговага аддзяленьня Аўтадору прымусіў іх прыняць меры. Асаблівую бязьдзейнасьць праявілі Астрашыцка-Гарадзецкая, Бярэзінская, Чэрвеньская раённыя арганізацыі, Менскае акругі.

Некаторыя ячэйкі Аўтадору, аднак, праявілі актыўнасьць. Узьдзенская раённая ячэйка арганізавала суботнік для рамонту тракту Ўзда-Лагойск. У суботніку прымалі ўдзел ня толькі члены Аўтадору, але і мясцовае насельніцтва, усяго—звыш 185 чалавек. Адрамантавана 11 кілём. дарожнага палатна. Ячэйка Аўтадору Блоньскага сельсавету, супольна з ячэйкай Асоавіяхіму, арганізавала выезд 12 вэлёсыпэдыстых па маршруце Пухавічы-Чэрвень. Па дарозе вэлёсыпэдная каманда правяла вялікую агітацыйную работу па ўцягненьні насельніцтва ў члены Аўтадору. Некалькі чалавек тут-жа на месцы ўнесьлі ўступныя і членскія ўзносы ў Аўтадор. У Чэрвені каманда выступіла на канфэрэнцыі палаўнічых. Канфэрэнцыя пастанавіла калектыўна ўвайсьці ў члены Аўтадору.

У Лагойскім раёне прыступлена да брукаваньня вёсак Слабада і Юркавічы Насельніцтва падвозіць каменьні і пясок, а кіраўніцтва і тэхнічны пэрсанал дае Аўтадор. Заканчваецца таксама пачатае ў мінулым годзе забрукаваньне вёскі Галіца, Астрашыцка-Гарадзецкага раёну.

Дзе толькі ёсьць ячэйка Аўтадору, паўкола яе згуртоўваецца актыў, што вядзе пастаянную работу за паляпшэньне стану нашых дарог.

Трэба шырэй разгарнуць сетку ячэек Аўтадору ў вёсцы, усім раённым і сельскім арганізацыям трэба аказваць максымальную дапамогу ячэйкам таварыства ў іх рабоце.

Ня трэба забываць, што справа барацьбы з бездарожжам—гэта ня толькі задача ячэек Аўтадору, але задача ўсёй савецкай грамадзкасьці.

ГОРДЗІН.

Прафарганізацыі, болш увагі рабоце Аўтадору!

Большасьць прафарганізацый слаба адгукнуліся на заклік Аўтадору аб пастаноўцы дакладаў Аўтадору на агульных сходах рабочых і служачых прадпрыемстваў і ўстаноў. Кампанія «тыдню Аўтадору» ў Менску яшчэ не набыла масавага характару. Толькі асобныя мясцовы прапрацавалі ў сябе на сходах гэтае пытаньне, паставіўшы яго амаль не ў бягучых справах. Амаль ні на адным прадпрыемстве, што аб'ядноўвае саюзам харчавікоў, акрамя хлебазаводу і заводу «Чырвоная Зара», няма ячэек Аўтадору. Саюз працасьветы зусім ня даў паказаньняў па мясцкомах.

Між тым, пытаньні аўтамабілізацыі краіны высунуліся цяпер на першы плян. Дагавор з Фордам, пабудова гігантскага аўтазаводу ў Ніжнім Ноўгарадзе ставяць перад ячэйкамі Аўтадору вялікія задачы—мабілізаваць грамадзкую думку вакол пытаньняў аўтамабілізацыі краіны і палепшэньня яе дарожнае гаспадаркі, пытаньняў падрыхтоўкі шофэраў і абслугі аўтамашын, азнаямленьня насельніцтва з канструкцыяй і кіраваньнем аўтамабілем.

Н. Г.

Хроніка „Двухтыднёвіку"

7-га чэрвеня на вучастку Ярмолаўка-Бараўляны арганізаваны «Дзень Аўтадору». Працавалі вёскі Бараўляны, Старадворышча, Баравая і Пярэжыр. Пракапаны канавы на 120 м., ачышчаны канавы на 150 мэтр. і зроблен насып на 150 мэтраў.

* * *

У вёсцы Слабада, Лагойскага раёну праведзены шматлюдны сход, прысьвечаны «Двутыднёвіку Аўтадору». Ужо праведзена планаваньне палатна і распачата брукаваньне вёскі. Усяго намечана забрукаваць 1.000 мэтраў.

* * *

Смалявіцкая ячэйка Аўтадору прыступае да забрукаваньня Чарніцкай вул. у Смалявічах. Усяго намечана забрукаваць каля 300 мэтраў.

Што зроблена па заметках рабселькораў

◎ **АРШАНСКАЯ АКК** паведамляе, што кулацкія прыслужнікі в Крупскага с.-г. таварыства былі засуджаны судом на розныя тэрміны зьняволеньня, але па амністыі вызвалены. Партыйцу тав. **Цытаўцу** абвешчана суровая вымова. Справа выкрыта заметкай **«Крупскае с.-г. т-ва крэдытуе кулакоў»** («Зьвязда» № 263).

◎ **ЗЬНЯТ З ПРАЦЫ** лясьнік **Жмурэўскі.** На яго вучастку было шмат парубак. Справа выкрыта заметкай **«Дубровенскаму лясьніцтву патрэбна чыстка»**, пасланай на расьсьледваньне ў Мазырскі акраз.

◎ **АБВЕШЧАНА СУРОВАЯ ВЫМОВА** партыйцу тав. **Ліцу** (Барысаў) за антыпартыйныя паводзіны. Справа выкрыта заметкай рабкора, пасланай на расьсьледваньне.

◎ **ЗЬНЯТ З ПРАЦЫ** і адданы пад суд сакратар **Гомельскага** аддзелу працы **Ерэнбург.** Пра яго рабкор пісаў, як пра растратчыка народных сродкаў. Расьсьледваньнем Гомельскае РСІ заметка **пацьвердзілася.**

◎ **ВЫЧЫСЬЦІЛІ З АПАРАТУ** Горацкай с.-г. акадэміі супрацоўніка **Ратковскага, А.,** як чужы элемэнт. Аб ім пісаў рабкор у заметцы **«Трэба пачысьціць апарат с.-г. акадэміі»**, пасланай у Аршан. РСІ на расьсьледваньне.

◎ **ПАСТАЎЛЕНА НА ВІД** старшыні зьлясарна-мэханічнай арцелі № 2 (Менск) **Сіняўскаму** за неэтычныя абыходжаньні з рабочымі арцелі. Аб **Сіняўскім** была паслана ў НК РСІ Бел. заметка **«Я гаспадар».**

◎ **ПЕРАДАНА ПРАКУРАТУРЫ** справа аб нядбайных адносінах да працы пры правядзеньні **Жардзянскага каналу** (Бабруйшчына). У выніку нядбайства канал пабудаваны вельмі дрэнна. Справа выкрыта заметкай рабкора **«Двайны профіль жардзянскага каналу»**, пасланай на расьсьледваньне ў Бабр. АКК-РСІ.

◎ **ГОРАЦКАЯ ПРАКУРОРУ** (Аршаншчына) перадана справа старшыні Горацкага райпрафбюро тав. **Пэрсікава.** Ён ня хоча плаціць належную з яго частку платы вулічнаму вартаўніку. Справа ўзьнята заметкай рабкора **«Бюракрат з райпрафбюро»**, пасланай на расьсьледваньне. Акрамя гэтага за ім выкрыты па заметках і іншыя злачынствы (махінацыі з дамамі). **Пэрсікаў зьнят з працы.**

◎ **КУЛАКІ-СТУДЭНТЫ** Лазарчык, Шакунь і Пячкурэнка выключаны з Горацкай с.-г. акадэміі. Справа выкрыта заметкай селькора **«Як кулак лезе ў школу»**, пасланай на расьсьледваньне ў Аршанскую АКК-РСІ.

◎ **ПАСТАЎЛЕНА НА ВІД** сакратару Белгалоўшосу т. **Хану** за карыстаньне казённай мэбляй у сябе дома. Аб гэтым пісаў рабкор у заметцы **«Вось якія»**, пасланай на расьсьледваньне ў РСІ.

Пастанова Калегіі НК РСІ Бел.

па справе аб невыкананьні ВСНГ Бел. пастановы СНК БССР аб арганізацыі курсаў для кваліфікацыі падросткаў

1) Паставіць на від ВСНГ Бел. у асобе т. ГІРШГОРНА. Ён не сачыў за сваячасовым выкананьнем пастановы СНК БССР. Гэта пастанова абавязвала падпарадкаваныя ВСНГ установы арганізаваць курсы для кваліфікацыі падросткаў. Прапанаваць ВСНГ у ДВУХТЫДНЁВЫ тэрмін выканаць гэтую пастанову. 2. Прапанаваць ВСНГ прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасьці дырэктараў трэстаў, якія яшчэ ня выканалі гэтае пастановы СНК.

Дзяржцырк

Праграма нашага цырку зноў абноўлена. Прыбыўшая група заслужаных артыстых яшчэ больш палепшыла рэпэртуар цырку. Сярод прыбыўшых артыстых трэба адзначыць заслужаных артыстых Грэці братоў «Танці». Праграма гэтых артыстых вытрыманая і багата здаровай дасьціпнасьцю.

Упяршыню ў Менску «10 Океанос»—група скакуноў, якія эьдзіўляюць сваімі багатымі трукавымі нумарамі.

Паводле пляну дзяржцырку, намечана правесьці ў Менску рад дзіцячых ранішнікаў. Першы ранішнік меў вялікі посьпех. У далейшым трэба зьвярнуць на ранішнікі больш увагі, бо яны вучаць правільнаму скарыстаньню фізкультуры.

У бліжэйшы час прыедзе ў Менск атракцыён «7 афрыканскіх львоў» з зоалёгічнага саду Гагенбэка (Нямеччына) пад кіраўніцтвам вядомага «укротителя» Эрнста-Шу. Апошні сам, будучы ў экспэдыцыі ў Афрыцы, злавіў і вывучыў гэтых ільвоў. З прычыны таго, што сэзон у Менску хутка скончыцца (21-га ліпеня), улічваючы, што гэты від мастацтва, зусім здавальняе шырокія пласты гледачоў г. Менску, трэба, каб адпаведныя органы ўзьнялі пытаньне аб працягу цыркавога сэзону ў Менску.

Г—ч.

Забастоўка пастухоў г. Калінкавічы

ГАСПАДАРЫ—КУЛАКІ І ГАНДЛЯРЫ—АДМОВІЛІСЯ ЗАКЛЮЧЫЦЬ З ПРАФСАЮЗАМІ ПРАЦДАГАВАРЫ

29 пастухоў пачалі забастоўку і выставілі пікеты

(Ад нашага мазырскага карэспандэнта)

Пастухі г. Калінкавічы (12 кілём. ад Мазыра) больш двух месяцаў дамагаюцца заключэньня дагавору з гаспадарамі, якія маюць жывёлу. Але гэта пастухом ніяк не ўдаецца. Ня гледзячы на шматлікія патрабаваньні ўпоўнаважанага саюзу с.-г. і лясных рабочых і гарсавету аб вылучэньні ўпоўнаважанага ад грамады для заключэньня дагавору, ніхто не зьявіўся, і дагавор дагэтуль не заключаны.

11-га чэрвеня пастухі абвясьцілі забастоўку, абралі забастовачны камітэт і выставілі пікеты. Забастоўка праходзіць пад кіраўніцтвам прафсаюзу. Батракі высунулі наступныя патрабаваньні: неадкладнае заключэньне дагавору, устанаўленьне для кожнага пастуха зарплаты ў 28 р. і сваячасовая яе выдача, а таксама выдача патрэбнай спэцвопраткі.

КУЛАКОМ НЕ ПАДАБАЕЦЦА ЎМЯШАНЬНЕ САЮЗУ

(Гутарка з старшынёю ЦП саюзу с.-г. і лясных рабочых т. Вайтэнка)

З поваду забастоўкі пастухоў г. Калінкавічы т. Вайтэнка паведаміў нашаму супрацоўніку наступнае:

— Да апошняга часу насельніцтва невялікіх гарадоў і мястэчак, дзе да гэтага часу была слабая абаронная работа прафсаюзу с.-г. і лясных рабочых, прывыкла без кантролю эксплёатаваць батракоў і пастухоў, плацячы ім мізэрныя грошы і крыўдзячы на кожным кроку.

Сёлета саюз с.-г. і лясных рабочых паставіў сабе мэтай ахапіць дагаварамі ўсіх батракоў і пастухоў. Калінкавічы аказаліся такім горадам, дзе ўплыў прафсаюзу с.-г. і лясных рабочых дагэтуль быў нездавальняючы і батракі і пастухі ня былі ахоплены працдагаворамі.

Даведаўшыся аб неабходнасьці заключэньня дагавору на пастухоў мясцовае насельніцтва абвясьціла маўклівы байкот гэтаму пачынаньню. Падбухторшчыкамі аказаліся, зразумела, мясцовыя кулакі і гандляры, у якіх ёсьць па некалькі кароў і якім нявыгодна плаціць пастуху па прафсаюзных стаўках.

Ня гледзячы на шматлікія заклікі абраць упоўнаважаных для заключэньня працдагавору з прафсаюзам, улаські жывёлы ігнаравалі гэтую прапанову і ўпоўнаважаных не абіралі.

Пастухі, **якія за час існаваньня савецкай улады палітычна значна вырасьлі, патрабавалі абвяшчэньня забастоўкі,** і цэнтральнае праўленьне саюзу с.-г. і лясных рабочых прымушана было забастоўку санкцыянаваць.

Аб настроі пастухоў сьведчыць тоен, што да 20 пастухоў, якія абвясьцілі забастоўку, **на другі-ж дзень далучыліся яшчэ 9 чалавек.**

Трэба сказаць, што **гэта першая забастоўка пастухоў у Беларусі і ЦП саюзу акажа пастухом усякае падтрыманьне, каб іх забастоўка скончылася перамогаю.**

2 МЕСЯЦЫ БЕЗ ДАГАВОРУ І ЗАРПЛАТЫ

(Гутарка з старшынёю Мазырскага акрпрафбюро—удзельнікам пленуму ЦСПСБ тав. Капмановічам)

— У дзень майго ад'езду з Мазыра—11-га чэрвеня—адбыўся агульны сход пастухоў г. Калінкавічы, які абраў забастовачны камітэт і абвясьціў забастоўку гаспадаром, якія ня хочуць заключаць з прафсаюзам дагавору.

Канфлікт паміж пастухамі і гаспадарамі цягнуўся ўжо 2 месяцы. Гаспадары ўпарта ня хочуць вылучаць упоўнаважаных для заключэньня дагавору з прафсаюзам і на ўсе запрагэньні мясцовага гарсавету зьявіцца на сход не зьвяртаюць увагі.

Пастухі-ж працуюць без дагавору **і не атрымліваюць ні зарплаты, ні спэцвопраткі.** Гаспадары іх кормяць толькі авансамі—па рублю-два.

Прафсаюз дабіваецца для пастухоў зусім нямногага: 28 руб. пэнсіі ў месяц (без харчаваньня), выхаднога дня і спэцвопраткі.

Прывыкшыя эксплёатаваць пастухоў бяз усякага кантролю, гаспадары лічаць, што прафсаюз не павінен умешвацца ў справу найму пастухоў, прычым **ігнаруюць, зразумела, усякія савецкія законы.**

Мы ўпэўнены, што дружна праведзеная забастоўка навучыць уласьнікаў жывёлы паважаць і цаніць працу пастуха.

МЕНСК

Інжынэрна-тэхнічныя мэтадычныя курсы

НК Асьветы адкрывае ў Менску пры Дз. Палітэхнікуме 2-х месячныя інжынэрна-тэхн. мэтадычныя курсы для перападрыхтоўкі выкладчыкаў індустрыяльных тэхнікумаў і прафтэхшкол.

Па курсах будуць чытацца тры циклі: агульнатэхнічны, энэргетычны і будаўнічы.

Для праслуханьня курсаў запрашаюцца інжынэрна-тэхнічныя работнікі, якія прапрацуюць на вытворчасьці. Для іх будзе прачытаны рад лекцый па вузка-тэхнічных пытаньнях.

Лектары запрошаны з Ленінграду і Масквы.

Адкрыцьцё курсаў намячаецца на 17 чэрвеня.

Усебеларуская нарада молодзі—членаў саматужных арцеляй

У Менску адкрылася Ўсебеларуская нарада молодзі—членаў саматужных арцелей. На першым пасяджэньні старшыня Беларускага саматужна - прамысловага саюзу т. Брысюін зрабіў яркі даклад аб задачах саматужнай кааперацыі.

30 тысяч рублёў на дапамогу пагарэльцам

Белдзяржстрах атрымаў дадатковыя весткі аб пажары ў вёсцы Жгунь каля Добрушы. Згодна паведамленьня агэнта Дзяржстраху, пажарам знішчана 89 двароў; страты значныя. Белдзяржстрах даў загад аб тэрміновай выплаце пагарэльцам страхоўкі ў суме каля 30 тысяч рублёў.

Дэлегат Беларусі на украінскім зьезьдзе Чырвонага Крыжу

Па запрашэньні Чырвонага Крыжу УССР, ЦК Чырвонага Крыжу БССР камандыравала на Ўсеукраінскі зьезд намесьніка старшыні ЦК тав Кандрашука. На украінскім зьезьдзе арганізуецца куток Беларускага Чырвонага Крыжу.

Падрыхтоўка кааперацыйных працаўнікоў

Пры Беларкаопсаюзе арганізуюцца 5-цімесячныя кааперацыйныя курсы. Курсы будуць падрыхтоўваць членаў праўленьняў і рэвізійных камісій спажывецкіх таварыстваў, інструктароў і г. д. з рабочых, батракоў, беднякоў і лепшай часткі сялян-сераднякоў. Размер стыпэндыі ўстанаўлецца для самейных 20 р. у месяц, а нясамейных 10 р.

Акруговы зьезд упоўнаважаных с.-г. кааперацыі

17-га ліпеня ў Менску адкрываецца акруговы зьезд упоўнаважаных с.-г. крэдытнай кааперацыі.

Зьезд вырашыць рад пытаньняў кааперавання сялянства ў акрузе, калектывізацыі і г. д.

Асобным пытаньнем у парадку дня зьезду будзе стаць даклад аб пяцігадовым пляне разьвіцьця сельска-гаспадарчай крэдытнай кааперацыі.

«СПОРТ»

ПАЧАЛІ БУДАВАЦЬ СТАДЫЁН

Гэтымі днямі пачалі будаваць спартыўны стадыён. Месца для стадыёну выбрана на Барысаўскім тракце, каля сельска-гаспадарчай выстаўкі.

У першую чаргу ў гэтым сэзоне будуць праведзены земляныя работы: рэсплянаваньне пляцовак футбольных, баскетбольных, гарадкоў і г. д. На пабудову стадыёну першай чаргі адпушчана ўжо 200 тысяч рублёў.

ПРЫЯЖДЖАЮЦЬ УКРАІНСКІЯ ФІЗКУЛЬТУРНІКІ

11 ліпеня ў Беларусь прыяжджаюць украінскія фізкультурнікі ў складзе 35 чалавек. Украінскія фізкультурнікі будуць мець таварыскія сустрэчы з беларускімі фізкультурнікамі па футболе, баскетболе і гарадкох.

Ужо вылучана камісія для сустрэчы украінскіх фізкультурнікаў.

СУСТРЭЧА ПА БАСКЕТБОЛЕ

Гэтымі днямі першая баскетбольная каманда цэнтральных курсаў фізкультуры мела сустрэчу па баскетболе са зборнай Менскай камандай з вынікам 39:19 на карысьць курсаў.

12 чэрвеня 2 каманда цэнтральных курсаў мела сустрэчу па баскетболе з першай камандай саўгандальслужачых з вынікам 19:9 на карысьць саўгандальслужачых.

ПАДРЫХТОЎКА ДА 11 ЛІПЕНЯ

Менскі акруговы совет фізкультуры прыступіў да падрыхтоўкі да сьвята 11 ліпеня (дзень вызваленьня Беларусі ад белапалякаў). У гэты дзень адбудзецца дэманстрацыя фізкультурнікаў, таварыскія спаборніцтвы па гульнях, лёгкай атлетыцы і г. д. У гэтым сьвяце прымуць удзел і украінскія фізкультурнікі.

ПАЧЫНАЕЦЦА ПРАФСАЮЗНЫ РОЗЫГРЫШ

Сёньня пачынаецца прафсаюзны розыгрыш па баскетболе, валейболе і гарадкох на пляцоўцы «Прафінтэрн» і стадыёне МБТ чыг.

Для ўдзелу ў розыгрышы запісаліся амаль усе прафсаюзныя каманды фізкультурнікаў.

АРГАНІЗАЦЫЙНЫ КАМІТЭТ СЯЛЯНСКАЙ СПАРТАКІЯДЫ

Прэзыдыум Менскага акруговага савету фізкультуры зацьвердзіў склад арганізацыйнага камітэту сялянскай спартакіяды.

У склад камітэту ўвайшлі прадстаўнікі ад МАСФ, ВСФК, культаддзелу ЦСПСБ, акрвыканкому, саюзу працзямлесу, вирана і ваеннеду.

«ДЫНАМА» І МЕНШВЭЙ АТРЫМАЮЦЬ ПРЫЗЫ

Прэзыдыум Менскага акрсавету фізкультуры пастанавіў выдаць [два прызы за мастацкае афармленьне і кольнасьць удзельнікаў камандам «Дынама» і Меншвэй. Прызы выдаюцца за ўдзел у дэманстрацыі, якая была прысьвечана 9 Усебеларускаму Зьезду Саветаў.]

Акруговыя зьезды саюзу будаўнікоў

Па ўсіх акругах праходзяць акруговыя зьезды саюзу будаўнікоў. Скончыліся зьезды ў Бабруйску і Барысаве. Праўленьні саюзу абноўлены амаль на 100 проц. Гэтымі днямі адбудуцца зьезды ў Гомелі і інш. мясцох.

Перакліч паміж цагельнямі

Менскія цагельні Белдзяржбуду прынялі выклік Колыскіх цагелень аб уступленьні ў сацыялістычнае спаборніцтва на паляпшэньне якасьці цэглы, павялічэньне выпуску прадукцыі за кошт зьмяншэньня глуму. У зьвязку з выклікам на менскіх цагельнях адбудуцца сходы для выпрацоўкі праекту дагавору з Колыскімі заводамі.

СУД

За кантрабанду

На працягу 1927 году муж і жонка Дзэнэты атрымалі з-за мяжы 7 пасылак спажывецкага характару, з якіх на сваё імя тры, а рэшту на імя розных асоб.

Як скарыстоўвалі Дзэнэты атрыманыя пасылкі?

Сьледзтвам устаноўлена, што пасылкі прадаваліся розным асобам, а грошы за іх перасылаліся за мяжу.

Пагаразьвіла мытніца Дзэнэт Майсея і Бэрту аштрафавала і супроць іх была ўзьнята крымінальная справа за парушэньне манаполіі заменнага гандлю: збыт на бок за плату прадметаў, якія прапушчаліся без ліцэнзій у паштовых пасылках, нічыцца кантрабандай.

Менскі акруговы суд, дзе разглядалася гэта справа, прыгаварыў Дзэнэт Берту і Майсея да пазбаўленьня волі са строгай ізаляцыяй тэрмінам на адзін год кожнага. Адбываньне кары Берце заменена штрафам у 200 руб., а Майсей па амністыі ад кары вызвалены.

Б.

Кіно

„Донна-Жуана"

Кіно-сад «Чырвоная Зорка»

У гэтым новым нямецкім «баявіку» паказана звычайная любоўная гісторыя, разгорнутая на фоне фэадалізму з яго рыцарскімі замкамі, дуэлямі, сэрэнадамі і г. д. Вытрымана карціна ў духу пэўдэ-гістарызму, бяз усякае спробы асьвяжыць матар'ял, паказаць сапраўдны ўклад фэадальнага жыцьця. Гэта галоўная загана фільму, якая робіць яго непатрэбным для нашага глядача.

Але адзінае, што заслугоўвае ўвагі ў гэтай карціне—гэта ігра таленавітай нямецкай артысткі Альжбэты Бэргнэр. Наш глядач ведае яе ўжо па фільме «Скрылач з Флёрэнцыі». У абедзьвюх карціпах артыстка паказала ўзор дасканалае ігры. У іншым фільм нічым не вызначаецца, няма характэрнай для нямецкіх фільмаў, якія мы тут бачылі, высокай кіно-тэхнікі. Фільм можна было і зусім не паказваць на нашым экране.

В.

З лістоў рабселькораў

ПАКРЫВАЮЦЬ РАСТРАТЧЫКАЎ

Гэтымі днямі ў Мазыры скончылася 2-я канфэрэнцыя саюзу камунальнікаў. У працэсе канфэрэнцыі выявілася, што па саюзе камунальнікаў ня ўсё добра.

У саюзе няма ўліку членскіх узносаў, ёсьць выпадкі запазычанасьці ад 6-ці да 14 месяцаў, частка ўзносаў прынята, але ня ўнесена на прыбытак. Быў і такі «выпадак». Па просьбе былога старшыні саюзу т. Шклярмана, у яго кніжцы была адзначана выплата членскіх узносаў за 3 месяцы, грошы-ж нідзе не запрыходаваны, а патрачаны па папойку перад адыходам Шклярмана ў армію.

Аб пастаноўцы ўліку грашовых сум ня было паведамлена канфэрэнцыя ў той час, як аб ненармальнасьцях ведала рэвізійная камісія і некаторыя партыйцы.

Па касе ўзаемадапамогі, скарбнікам якое быў сакратар саюзу т. Голад, вінаваты ў бясчынствах у саюзе, таксама наглядаецца рад ненармальнасьцяй.

Адсутнічае ўлік членскіх узносаў, запазычанасьць не спагняецца, пазыкі выдаюцца ўсім, нават тым, на каго ўжо ёсьць выканаўчы ліст аб спагнаньні запазычанасьці. Шклярману, як добраму прыяцелю скарбніка касы, была выдана беззваротная пазыка ў сумі 20 руб., у той час, як тым, хто больш адчуваў у ёй патрэбу, адмаўлялі нават у 5-ці рублёх.

Скарбніку касы т. Голаду, які і да гэтага часу вінен у касу ўзаемадапамогі будаўнікоў 20 з ліпкам рублёў, была выдана пазыка ў разьмеры 50 рублёў. Перад ад'ездам з Мазыра ў Жыткавічы на новае месца работы Голад у сваім рахунку падчысьціў лічбу 50 р. і паставіў 10. Такім чынам ён адразу «ўнёс» 40 рублёў.

Рэвізійная камісія саюзу і касы ўзаемадапамогі і некаторыя прыяцелі Голада стараюцца замазаць гэтую справу.

Члены касы і члены саюзу абураны падобным бясчынствам. Ня гледзячы на тое, што 2-я канфэрэнцыя саюзу запрапанавала рэвізійнай камісіі тэрмінова зрабіць дэтальную рэвізію, яна ўсё сьпіць пад песьні прафсаюзных «правадыроў».

ВЕДАЮЧЫ.

САМАДУР МАСЛАКОЎ

Аказваецца, што 12 год існаваньня савецкай улады некаторых чыгуначных чыноўнікаў нічому не навучыла. Аказваецца, што «жыў яшчэ Курылка», што не адыклі яшчэ чыгуначныя бюракраты ад сваіх старых замашак.

Гутарка ідзе аб старшым памочніку начальніка (ДСП) станцыі Полацак, МБВ чыг. Маслакову. Як-бы ён ні любіў вытворчыя нарады (навошта вытворчыя нарады, раз я—сам старшы ДСП), але загады трэба выконваць. І вось, лаючы ў душы ўсіх і ўсё, ідзе наш Маслакоў да грузчыкаў на вытворчую нараду. А калі рабочыя загаварылі пра непаладкі на станцыі, пра прастоі вагонаў, пра мэханізацыю, пра абураючую пастаноўку тэхнікі бясьпечнасьці—ня вытрымала сэрца ДСП Маслакова: ён **дэманстрацыйна** пакінуў вытворчую нараду. І вось у пратаколе гаворыцца: **«з прычыны дэманстрацыйнага выхаду ДСП Маслакова, вытворчая нарада зрываецца».**

Але больш за ўсё ня любіць Маслакоў саюзу. Паводле Маслакова саюз трансраб—лішняя арганізацыя, якую трэба ліквідаваць. Ну, а з прычыны таго, што прагнаць саюз у Маслакова рукі кароткія, **дык ён гоніць з габінэту старшыню саюзу,** які прыходзіць да яго для пераговараў наконт калдагавору і вырашэньня канфлікту.

Трэба Маслакову **наказаць** яго месца. А месца яго там, куды жалезная мятла чысткі апарату **вымяце** ўсё сьмецьце, усё тое, што перашкаджае справе нашага будаўніцтва.

Б. А.

Упарта змагаемся за ўздым ураджайнасьці

Сяляне пасёлку «Чырвоныя Зарэкі» (Полаччына), які нядаўна арганізаваны пры зямляўпарадкаваньні, на агульным сваім сходзе пастанавілі:

1) пашырыць у гэтым годзе пасеўную плошчу. Усім, як адзін, гаспадаром сеяць толькі ачышчаным насеньнем;

2) захаваць у агрыкультурным становішчы сенажаці, для чаго навысякаць хмызьняк, паразаць куп'ё і забаранаваць;

3) пракапаць праз балоцістае месца сенажаці канаву і ня пушчаць на сенажаць сьвіней;

4) калектыўна заараць агарод, які ёсьць у пасёлку, і прыбытак з яго пусьціць на здабыцьцё сельгасмашын для калектыўнага карыстаньня пасёлку;

5) калектыўна перавезьці ўсе будынкі з вёскі ў новы пасёлак;

6) пабудаваць—праз арганізацыю суботнікаў—хату бедняку Трафімаву.

Усе гэтыя мерапрыемствы пасялкоўцы праводзяць ужо ў жыцьцё. Праводзіцца ачыстка сенажаці ад хмызьняку і куп'я, сухія месцы ачышчаюцца ад хмызьняку і заворваюцца пад пасеў. Прыступлена да пабудовы калектыўнага гумна і пасадкі агульнага саду і г. д. Зямля пасёлку пераведзена на шматпалёвы севазварот. Арганізавана машыннае таварыства.

Пасялкоўцы ўпарта пачалі змагацца за падняцьце ўраджайнасьці, за новае жыцьцё. Ініцыятарамі ва ўсёй гэтай справе зьяўляюцца: камуністы **Каласоўскі,** камсамолец **Кісель** і член сельсавету **М. Шутко.**

Праводзячы ў жыцьцё намечаныя мерапрыемствы па ўздыме ўраджайнасьці, пасёлак «Чырвоныя Зарэкі» выклікае на спаборніцтва пасёлак № 3 в. Усьцеў-Сардыцкага, Дрысенскага раёну, і пасёлак Сяляўшчына, Расонскага раёну.

Селькор **УСЬМІНСКІ.**

Навука і тэхніка

ДЫМАВАЯ ЗАСЛОНА, ЯК СРОДАК ПРОЦІСАМАЛЁТНАЙ БАРАЦЬБЫ

Нядаўна ў Фрыдляндзе (Усходняя Прусія) у прысутнасьці вайсковых спэцыялістых і вышэйшых чыноўнікаў былі зроблены досьледы ўжываньня дымавой заслоны, як сродку барацьбы з паветранай атакай. Аб'ектам «нападу» была абрана цэнтральная электрычная станцыя Фрыдляндзе; дымавая заслона павінна была захаваць ад варожых самалётаў будынак станцыі і захаваць яе ад бомб. З гэтай мэтай вакол станцыі было растаўлена 60 апаратаў для стварэньня дымавой заслоны. Калі тры самалёты, якія выяўлялі паветраны флёт праціўніка, зьявіліся на кругавідзе, па сыгнале начальніка абароны апараты былі пушчаны ў ход. Праз некалькі хвілін будынак электрастанцыі і вакольная мясцовасьць аказаліся ў хмарах густога дыму, які зусім захаваў станцыю. Ня гледзячы на моцны вецер, заслона трымалася ўвесь час, пакуль апараты працавалі. Досьледы, такім чынам, аказаліся зусім удалымі.

НОВАЯ ВЫРАТОЎЧАЯ ПРЫЛАДА

Нядаўнія морскія катастрофы з чалавечымі ахвярамі (загібель парахода «Вэстрыс» у Ціхім акіяне і інш.) прымусілі выпаходцаў усіх краін запяцца адшуканьнем новых надэйных выратоўчых прылад. Ангельскі інжынэр Кэмпбэл запатэнтаваў вельмі дасьціпную прыладу, якая ўхвалена спэцыялістымі морскае справы. Прылада Кэмпбэла зводзіцца да таго, што спрэдняя частка палубы робіцца ў выглядзе вялікае скрыні, якая вольна ляжыць на падпорах. Пры першых адзнаках надыходзячай небясьпекі, пасажыры зьбіраюцца ў гэтую скрыню. З пагружэньнем судна ў ваду, скрыня сама сабою выплывае на паверхню і плавае на вадзе, пакуль паведамленыя аб катастрофе па радыё судны не падыдуць да месца аварыі і не падбяруць пацярпеўшых. З прычыны таго, што апарат Кэмпбэла зьнішчае лодкі і іншае выратоўчае абсталяваньне, ён, па думцы спэцыялістых, зьяўляецца самай таннай выратоўчай прыладай.

ДАКТЫЛЯСКОПІЯ І АМЭРЫКАНСКІЯ ЗЛАЧЫНЦЫ

Некалькі год назад крымінолёг (крыміналёгія—навука аб злачынцах і злачынствах) Бертылён запрапанаваў у якасьці мэтаду апазнаньня злачынцаў вывучэньне адбіткаў вялікага пальца (дактылёскопія). Навука гаворыць, што дзьве асобы з адпаўкавым разьмяшчэньнем складак скуры на вялікіх пальцах могуць зьявіцца ў працягу часу ня менш дзесяці тысяч год; таму практычны мэтад Бэртылёна зьяўляецца абсалютна дакладным і атрымаў усеагульнае прызнаньне. За некалькі дзесяткаў год яго ўжываньня ён аказаў сьледчым органам каштоўныя паслугі, часта зьяўляючыся адзіным і матэматычна дакладным спосабам выкрыцьця злачынцы. Аднак, у сучасны момант тэхніка злачынствуе, прынамсі, у Амэрыцы, дайшла да такога разьвіцьця, што і дактылёскопія пачынае «даваць асечкі». Спрактыкаваныя злачынцы, адпраўляючыся «на работу», надзяюць гумовыя рукавіцы. Але гэтага мала, некаторыя віртуозы злачынства рамяства дайшлі да таго, што наўмысьля пакідаюць на месца злачынства фальсыфікаваныя адбіткі з мэтай зьбіць паліцыю з толку і павесьці яе на фальшывы след. Дзеля гэтага злачынцы і карыстаюцца гумовай рукавіцай, на якой мастацкі зроблены ўсе дэталі чалавечай рукі.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

— МенАКК паведамляе, што 15 чэрвеня, а 10 гадзіне раніцы, у памяшканьні АКК (вул. Энгельса, малая заля клюбу імя Карла Маркса) адбудзецца нарада членаў праверкомаў па праверцы і чыстцы вайсковых партарганізацый.

Яўка абавязкова.

Папраўка

У «Зьвязьдзе» № 131 у допісе «Вярасьлі на 215 чалавек», павінна быць «ВЫРАСЬЛІ НА 45 ЧАЛАВЕК», тое самае ў такэсьце допісу, дзе гаворыцца аб 215 чал. павінна быць—45 ч.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ

Летні тэатр «ПРАФІНТЭРН»
Гастролі Ленінградзкага «Красного театра»
Пятніца, 14 чэрвеня „Холщевые штаны"
Камэдыя у 4-х дзеях, Лебедзева.

КІНО-ТЭАТР „Культура"
Сёньня і штодзённа МАСТАЦКІ БАЯВІК
Скрозь сьлёзы
Кіно-апавяданьне у 7 ч. паводле твору ШОЛОМ-АЛЕЙХЕМА.
Пач. роўна а 8 г. увеч. Каса—ад 6 гадз.

Кіно-сад Чырвоная Зорка Савецкая, 71.
Новы нямецкі баявік
ДОНА-ЖУАНА
2 сэансы—пачатак 1-га а 9 г., 2-га а 10 г. 30 м
Каса ад 7 гадз.

КІНО Інтэр